№ 7 чэрвень 2003

# Свой Лад

інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

Гродзенскага аддзяленьня ГА «Фонд імя Льва Сапегі»

**У нумары:**

- пад знакам Льва
- грамадзтва
- сумежжа і замежжа
- актуаліі



## 5 чэрвеня дзень памяці нябеснай апякункі Беларусі Ефрасіні Полацкай

# У чорных плямах гістарычнай памяці

*Старадаўная мудрасьць кажа, што народ, які забыўся сваю мінуласьць, асуджаны перажыць яе зноў. Ніхто ня хоча вяртацца ў цяжкую мінуўшчыну, каб зноўку зьведаць яго боль. Кожны хоча будаваць сьветлую будучыню для сябе і сваіх нашчадкаў, дасягнуць посьпеху, абысьці няўдачы на сваім жыцьцёвым шляху. А адным з найлепшых дапаможнікаў ухіленьня ад катастрофы ёсьць гістарычная памяць.*



Ніхто з нас не хацеў бы больш зьведаць страшэнных жудасьцяў тае вайны, сумная гадавіна ад пачатку якой прыпадае на чэрвень. Кожны чацьвёрты беларус не дажыў да яе заканчэньня. Якая жахлівая лічба! А чаму так сталася? Чаму народ, які сам не абвяшчаў нікому вайны, ні яму ніхто, і наагул не хацеў ваяваць, так моцна ўцярпеў? Вельмі важна знайсьці адказ на гэтае пытаньне, калі мы ня хочам перажыць таго жаху яшчэ раз.

Вайна, пачаткам якой у Беларусі лічыцца 22-га чэрвеня 1941-га году (напад Нямеччыны на Савецкі Саюз), у Гародню прыйшла ў 1939-м. Тады беларусы, якіх пабралі ў польскае войска, мусілі ваяваць на два франты: супраць гітлераўскіх войскаў на захадзе, а таксама супраць Чырвонай арміі на ўсходзе, у якой таксама было няшмала беларусаў. Вось яно і выходзіць, што ўжо з 39-га году беларусы пачалі малаціць адзін аднаго. Ня дзіва, што мы ў вайшлі ў рэкардсмэны паводле колькасьці ахвяраў. Дарэчы, гэта было не ўпершыню. Таўклі беларусы самыя сябе і ў напалеонаўскай вайне. Не давалі спуску сваім земляком у грамадзянскай, і ў усіх іншых войнах, паўстаньнях, бойках, якія чыніліся пасьля страты беларусамі незалежнасьці і свае дзяржавы. Страціўшы свабоду, мы сталі забіваць самыя сябе.

Ваявалі беларусы і ў Чырвонай арміі, і ў Войску польскім, і ў Арміі краёвай, і ў чырвоных партызанах, і за Нямеччыну і за Сталіна. А называлі адзін аднога - ворагамі і здраднікамі. Хоць часьцяком былі сваякамі, расьлі ў адной вёсцы. Страціўшы сваю вольную Бацькаўшчыну, называлі радзімаю мноства чужынаў, ад савецкае дзяржавы - да ніколі не існавалых прыдумкаў. Вось і ня ведаем, каго перш-наперш вінаваціць ў усіх нашых бедах. Ці чужакоў якіх, каторым да нас не было і ня будзе аніякае справы, ці сябе самых.

Большасьць з тых, што ня ведалі за якую ўладу ваяваць, былі звычайнымі, добрымі, руплівымі і гаспадарлівымі людзьмі. Марылі пра дабрабыт і годнае жыцьцё сваіх дзяцей, не шкадуючы сілаў працавалі на іх будучыню. І ніхто ім не даводзіў, хто такі Гітлер, ці хто такі Сталін. Толькі ўрад свае незалежнае дзяржавы мог гэта зрабіць. Але такога ўраду не было. Вось і выходзіць, што не быты незалежнасьці заўсёды павялічваюць колькасьць ахвяраў, дзе бі дзеля якой мэты гэтыя войны ні вяліся. І гінулі на гэтай вайне беларусы, ад невядомага Яські з невядомага хутару, да знакамітага патрыёта і змагара за незалежнасьць Беларусі, генэрала Булак-Балаховіча, які загінуў бароначы Польшчу ад гітлераўцаў. Не забыцца б нам гэтае навукі зараз, зрабіць бы адпаведныя высновы. Можа досыць нам чорных плямаў у нашай гістарычнай памяці. Лепш іх асьвятляць успамінамі, чым заліваць уласнаю крывёю.

Ня ўсе людзі ў Беларусі нават цяпер лічаць такія высновы разумнымі. Па-ранейшаму ідуць гутаркі пра агульную грашовую прастору з Расеяй, пра патрэбу паглыбленьня інтэграцыі, пра адзіную дзяржаву. Зноў пра адзіную! Але гістарычная памяць нам падказвае, што не рубель, ці, як яго называюць у народзе, абрубак, можа даць дабрабыту нашай Бацькаўшчыне, а толькі ўласная валюта. Што не чужое войска можа абараніць наш народ, а толькі сваё. Што ніхто пра нас не паклапоціцца, калі мы самыя пра сябе не паклапоцімся.

У траўні працягвалі клапаціцца за нас іншыя. Перш за ўсё здумалі, што нам ня трэба чытаць "Беларускай дзелавой газэты". Такое зьмеркаваньне прыпала якраз на той месяц, у якім сьвяткаваўся дзень свабоды друку, і міжнародны, і свой уласны. Заклапочанасьць пра нас ня мае нейкага там новага зьместу. Да закрыцьця газэт мы звыкліся, як да інтэграцыі з Расеяю. Часамі здаецца, што яны ідуць паралельна, чым больш інтэграцыі - тым больш закрываецца газэт. Дзіўныя нейкія супадкі. Ну, а калі інтэграцыя набывае вельмі хуткі тэмп - тады да закрыцьця далучаюцца і грамадзкія арганізацыі, як, прыкладам, травеньская спроба зьліквідаваньня "Ратушы".

Ці ў Гародні няма іншых праблем? Бо для пераважнае большасьці гарадзенцаў галоўнаю праблемаю траўня стала эпідэмія мэнінгіту. Пакуль мэдыкі шукаюць прычынаў эпідэміі, простыя грамадзяне далі ўжо сваю ацэну: горад пакараны за разбурэньне могілак. Нават дзікуны не абходзяцца з чалавечымі касьцьмі так, як гэта зрабілі "цывілізаваныя" людзі. Танцы на чалавечых касьцях - па-іншаму і не назавеш. Але чаго можна чакаць у горадзе, на цэнтральным пляцы якога стаіць помнік Леніну! Дзякуй Богу, яшчэ не дажыліся да канібалізму. Але ўжо мала бракуе.

Тыя, хто шукае хваробы ў вадзе, ці ў струпянелых касьцях можа там яе і знойдзе, але гэта толькі вонкавы бок. Запраўдная хвароба, найстрашэньнейшая, жыве ў душах тых людзей, якія могуць абходзіцца з чалавечымі касьцямі, як з сабачымі. Акаляжа на ўсіх. Ці тут ці цяпер, ці там... пазьней. Бо, калі большасьць людзей кладуцца спаць ці едуць на адпачынак, ці займаюцца яшчэ чым - іншыя людзі, ад імя маўклівае згоды першых могуць чыніць няпраўду. Але адказнасьць кладзецца на ўсіх. І за разбурэньне габрэйскіх могілак у Гародні, і за зьдзек з памяці нявінна забітых людзей у Курапатах, дзе на чалавечых касьцях будуюцца катэджы. Да якіх жа межаў гэтае нелюдзтва можа дайсьці? Гэтая праблема ёсьць перш-наперш духовым заняпадам. І палягае яна на тых чорных плямах нашае гістарычнае няпамяці.

На паседжаньні "Гарадзенскае ініцыятывы" падтрамалі прапанову абзбору подпісаў ў абарону Курапатаў. Толькі тады, калі жывыя будуць бараніць сваіх памерлых і ўшаноўваць іх памяць - мы можам разьлічваць і на праўдзівае аднаўленьне гістарычнае памяці народу, што ня дасьць яму далей рабіць жудасных памылак, і страчваць за адну вайну кожнага чацьвёртага суайчыньніка.

У гэтым месяцы, гарадзенцы, якія шануюць свае традыцыі - рыхтуюцца да сьвяткаваньня аднога з найдаўнейшых беларускіх сьвятаў, Купальля. Іншыя ж, зноў кінуліся на выбары. На гэты раз нават не ўзьнікае думкі, каб паставіць у ладзе нейкія ўмовы, альбо абмеркаваць магчымасьці няўдзелу ў выбарах. Здаецца, зусім нядаўна былі мінулыя. Але высноваў з іх ніхто не зрабіў. Нават болш-менш талковага аналізу. Чарговая чорная пляма. Колькі ж можна ўжо іх перакрочваць? Можа прыйшоў час зьвярнуцца ў малітвах па раду да нашай нябёснай апякункі Ефрасіні Полацкай, дзень памяці якой беларусы адзначаюць у гэтым месяцы.

**Віктар Сазонаў**

# Праца: кара ці мара?

**Праца для чалавека – гэта спосаб існаваньня, дзяльніца шуканьня сэнсу, крыніца думаньня, урэшце, спосаб карысна скарыстаць час.**

А што значыць праца для беларускага чалавека? Як ведама, беларус славіцца сваёю працавітасьцю. Для ўсіх нас яна крыніца існаваньня, хоць і не самавітая. Праца надае беларусу пачуцьця ці ня поўнай апраўданасьці за сваё жыцьцё выя слабасьці. Ужо не адно стагодзьдзе ён цяжка працуе не пакладаючы рук, а жыцьцё яго ў сёрою назастаецца бедным, убогім, незарганізаваным, калі-дык нават брудным.

Калі выходзіць зь Бібліі, то цяжкою працаю на кожны дзень чалавек быў не ўзнагароджаны, а пакараны за грахі свае. З гэтай пары праца набывала свой ства ральны сэнс толькі тады, калі дзейнасьць чалавека скіроўвалася на набліжэньне, крок за крокам, да таго "раю", зь якога аднойчы ён быў выгнаны. Ці наблізіўся беларус за ўсе стагодзьдзі, дзесяцігодзьдзі, астатнія гады да свайго раю так, каб можна было сёньня казаць аб слушнасьці выбранага шляху? Пытаньне рытарычнае. А раз набліжэньня да раю не відаць, то ці мае мы права шчыра ганарыцца сваёю працавітасьцю? Сытуацыя была б парадаксальная, калі б не рознабаковасьць сьвету. Не гармануе фізычная працавітасьць беларуса зь яго жыцьцёваю лянотай: нежаданьнем зразумець іншага, лянотаю аналізаваць праблемы, урэшце, павярнуцца да самога сябе, зьмяніцца, удасканаліцца.

Што дае праца ў правінцыйных мястэчках: Бераставіца, Сьвіслач, Іўе?.. Прыкладна 0.3– 0.4% працуюць у дзяржаўным сэктары (ён у нас пакуль што пануе), атрымоўваюць заробак за 400 тыс. рублёў. Зазвычай гэта людзі, якія не займаюцца стварэньнем вартасьцяў, але маюць дачыненьне да арганізацыйнага забесьпячэньня дзейнасьці палітычнага рэжыму і разьмеркаваньня вартасьцяў. Гэта ім мы абавязаныя сваімі цяжкасьцямі і ўбогасьцю. Многія зь іх, забыўшыся на сваё сялянскае мінулае, уяўляюць сябе "вылучнымі" сярод "астатняга сьмецьця".

Наступныя 2-2,5% грамадзян, з заробкамі за 160 тыс. рублёў – гэта сфэра адміністрацыйнага абслугоўваньня вышэйазначанае групоўкі грамадзян. Часткова сюды ўходзяць і тыя, хто займаецца працаю ў розных арганізацыях. Сюды ж улучаюцца і найадукаванейшыя, як для нашае правінцыі, людзі ўсіх роўняў.

Рэшта, каля 97 % працоўных грамадзян, заробак якіх ніжэй шы за 160 тыс. рублёў, можна назваць ахвярамі палітычнае сыстэмы, ахвярамі свайго выбару, - выбару прэзыдэнта, дэпутатаў усіх роўняў, ахвярамі страху, што адбяруць нават тыя капейкі, якія "плаціць" "ён". Жалюгодная ўзнагароды за васьмігадзіннае шаленства на працы, мізэрныя пэнсіі на старыя гады. На ўтрыманьне жытла, пры эканоміі на адзеньні і добрым харчаваньні, ім даводзіцца выдзяляць увесь месячны заробак. Жывем паводле Маркса, што чалавеку патрэбна перш за ўсё. А больш можна не даваць.

Але пакінем цяжкія ўражаньні ад эканомікі "рынкавага сацыялізму", у тэарэтычных лябірынтах якога нікне карысьць ад нашай працавітасьці, і пяройдзем да беспрацоўя. На паперах стан зь беспрацоўем выглядае нязгоршым. Тэарэтычна - ёсьць нават змога забясьпечыць працай усіх. Але насамрэч тое, што прапануецца, нагадвае забесьпячэньне працаю ўцекачоў зь бяднейшых краін. Палі і фэрмы калгасаў чакаюць вас, будаўнікі "рынкавага сацыялізму"! А ці варта працаваць на месцах, функцыянаваньне якіх мае больш палітычнае, чым эканамічнае значаньне? Ці адпавядаюць умовы працы на сёньняшняй вёсцы, ровеньу знагароды за працу сучасным цывілізаваным патрабаваньням - пытаньне рытарычнае. Можа нам супакоіцца і падобную працавітасьць успрымаць як лёзунг "Пераадолеем часовыя цяжкасьці!"?

Аднак пры будаваньні міні-СССР ў адной асобна ўзятай невялікай дзяржаве цяжкасьці, характэрныя для неарганізаванага грамадзтва - зьява бясконцая. Сацыялістычная схема ка забесьпячэньня людзей працаю - разбуральная для грамадзтва. Камандна-адміністрацыйная сыстэма ніколі ня мае грошай на стварэньне прыстойных месцаў працы, дзе чалавек мог бы спакойна і дарэчна ахвяраваць восем гадзін свайго жыцьця ў дзень. Нават сама ўбогі чалавек, сьведама пагаджаючыся на падман, прагне ў душы справядлівасьці. Але дарма, замкнёная ў сабе ўлада ніколі не пасьпявае за агульначалавечым разьвіцьцём.

Наша ўлада па-рознаму стымулюе беспрацоўе. Прыкладам, калі грамадзянін шмат траціць энэргіі на палітычнае жыцьцё ня ўзгодненае з "генэральнаю лініяй", то ён проста выкідваецца з рынку працы і ня мае права на жадную канкурэнцыю. Ведама, трэба ж застрашыць іншых, спаралізаваць палітычную сьведамасьць чалавека. "Мы ня пойдзем за цывілізаваным сьветам!" І ня ідзем. Выкінутай з рынку працы можа адчуць сябе асоба, якая на ўласнае жаданьне, звольнілася з калгасу. Асабліва адчулі гэта грамадзяне, што звольніліся з калгасаў Бераставіцкага раёну. Улада ламае лёсы людзей не зважаючы на сумленьне і правы.

Гледзячы на нашую палітычную сыстэму нельга не зьдзіўляцца. Пасьля апошніх выбараў у мясцовыя Саветы зьявілася



найноўшая форма беспрацоўя – беспрацоўны дэпутат. Аўтар гэтага артыкулу ўжо дзесяць гадоў у палітыцы альтэрнатыўнай у раду. Дзесяць гадоў клопатаў з працаю. Дзесяць гадоў гульняў у "чалавечнасьць" з высокіх трыбун. І зусім па-чалавечаму нікога не цікавіць, чым жыве мая сям'я. Добра, калі я такі "антыграмадзкі", дык чаму ж астатнія жывуць у жабрацтве, і з працаю і бяз працы? Выходзіць мы і мары, пра лепшае жыцьцё, тых, хто мяне абраў, гноем павінны легчы дзеля таго, каб нехта спакойна і смачна мог жэрці. Ну а ты, прыстойны беларус, дзе ты? Ты ж грамадзянін Рэспублікі Беларусь, у якой ёсьць створаны тваёю працаю і падаткамі бюджэт. Як ты мог дазволіць, каб нехта распараджаўся грашыма твае дзяржавы, нават табою? Не сядзяць пры ўладзе справядлівыя, калі ўнізе, у турмах, сядзяць журналісты!

*Уся нашая сыстэма - ня што іншае, як палітыка недаверу да чалавека, нежыцьцяздольны гібрыд сацыялізму пад маскаю рынкавай эканомікі. Усё гэта моцна нагадвае Сярэднявечча. Не дапамаглі нашым людзям звычайная працавітасьць адных пры бясконцай прагавітасьці іншых. І ня трэба сёньня паўтараць старых абмылаў, бо неўзабаве ўжо можам страціць Беларусь.*

***Алег Рамашкевіч,***
***дэпутат раённага Савету,***
***Бераставіца***

# Доўгі рубель, але танны



За апошні месяц, кошт 1 даляру ЗША ў беларускіх рублёх узрос на 1,03%, а эўра – на 7,51%. Даныя лічбы сьведчаць аб імклівым зьняцэньваньні нацыянальнае грашовай адзінкі Беларусі. Аднак можа гэта тэндэнцыя толькі апошняга месяцу? Паглядзім на “паводзіны” беларускага рубля пачынаючы зь 1 студзеня 2003 г. па 8 чэрвеня 2003 г. (час аналізу). Курс даляру ЗША ўзрос ад 1920 беларускіх рублёў да 2047, курс эўра ад 1993 беларускіх рублёў да 2423, што адпаведна зьняцэніла кошт нацыянальнай грашовай адзінкі Беларусі што да даляру ЗША на 6,61%, да эўра на 21,58%. І ўсё гэта толькі за пяць месяцаў і адзін тыдзень...

Параўнаем паказьнікі нашых суседзяў за той самы пэрыяд:

- латвійскі лат ўзрос да даляру больш чым на 10% і нязначна панізіўся да эўра;

- літоўскі літ страціў свае пазыцыі да “адзінай” эўрапейскае валюты і ўзмацніўся да даляру ЗША больш чым на 15%;

- польскі злоты ўзмацніўся на 7% да даляру і зьняцэніўся на 8,5% да эўра;

- расейскі рубель узмацніў свае пазыцыі да даляру ЗША больш чым на 3% і паслабіў на 12,8% да эўра;

- украінская грыўна на дзясятыя долі працэнту ад даляру ЗША ўзмацнілася і больш чым на 14% зьняцэнілася да эўра.

Такім парадкам, з памянёных “суседаўскіх” нацыянальных грашовых адзінак і беларускага рублю, наша валюта – адзіная, якая страціла свае пазыцыі да даляру ЗША і наагул – рэкардсмэнка ў зьняцэньваньні што да эўра.

Згодна з гэтым, паўстае пытаньне: “Ці выгадныя, прапагандаваныя сябрамі праўленьня Нацыянальнага банку Беларусі і сябрамі Ўраду – Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, уклады ў беларускіх рублёх ці прывабнейшыя і прыбытковейшыя спосабы захоўваньня сваіх ашчаджэньняў у банкаўскіх установах краіны?”

Але 8 чэрвеня 2003 г. сярэдні працэнт укладаў у беларускіх рублёх па банках гораду Гародні, які ў цэлым па краіне, складаў 34% гадавых. Калі разгледзець даны паказьнік ад пачатку бягучага году, то ён у сярэднім складае 37,5%, што прыблізна 3% ў месяц. Шмат гэта, ці не?

Пэўна ж, з улікам рэальнай інфляцыі – вельмі мала. З гледзішча розных банкаўскіх укладаў. . Паглядзім на табліцу.

| Дата / Від укладу | 1 студзеня 2003 | 8 чэрвеня 2003 | | |
|---|---|---|---|---|
| | роўная сума ўкладу | Без уліку працэнт на працэнт | | |
| | | у бел. рублёх | у далярах ЗША | ў эўра |
| У бел. рублёх пад 37,5% гадавых | 2 000 000 | 2 330 000 | 1138 | 962 |
| У далярах ЗША пад 7% гадавых | 1042 | 2 198 000 | 1074 | 907 |
| У эўра пад 7% гадавых | 1004 | 2 508 000 | 1225 | 1035 |

Прымяркуем, што на 1 студзеня 2003 г. вы мелі 2 000 000 беларускіх рублёў, гэта было эквівалентна 1042$ ЗША ці 1004€.

Пры ўкладзе ў беларускіх рублёх вы б павялічылі сваю грошовую маёмасьць на 96$ ЗША, аднак паменьшылі б на 42€; пры ўкладзе ў далярах ЗША - павялічылі б на 32$ і паменшылі б на 97€ (!); пры прыўкладзе ў эўра за 5 месяцаў і тыдзень Вашыя 1004€ ператварыліся б у 1035€ (+ 31) ці 1225$ ЗША (+183) ці 2 508 000 бел. рубл. (+508 000). Такім парадкам, на пастаўленае вышэй пытаньне можна адказаць наступным спосабам: найвыгаднейшы валютны ўклад ў эўра, а ня ўкладу беларускіх рублёх, прапагандаваны шматлікімі дзяржаўнымі дзеячамі Беларусі. Больш таго, з улікам паступовага паніжэньня Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь стаўкі рэфінансаваньня памяншаецца працэнт ў укладах у беларускіх рублёх, што робіць дадзены від укладу меньш прывабным.

Здаецца, што з студзеня 2004-га году, з магчымым аднацасным уводам на тэрыторыі Беларусі расейскага рубля, адплыў укладаў у беларускіх рублёх будзе вокамгненным.

На чацьвёртым паседжаньні беларуска-расейскай сумеснай працоўнай групы распрацоўваньня прапаноў аб утварэньні адзінага эмісійнага цэнтру Саюзнай дзяржавы, што мінуў 7-га чэрвеня ў Менску, канчатковае зьмеркаваньне аб уводзе ў карыстаньне расейскага рубля ў якасьці адзінага плацельнага сродку на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ці адначасным хаджэньні беларускага і расейскага рубля з 2004-га ці 2005 году не прынялі.

Нагадаем, што згодна з пунктам 3.2 праграмы дзеяньняў Рэспублікі Беларусь і Расейскай Фэдэрацыі ў рэалізацыі настаноў Дамовы аб стварэньні саюзнай дзяржавы ў 2005 годзе павінна адбыцца ўвядзеньне адзінай грашовай адзінкі. (У зьвязку з пунктам 3.1 Праграмы, грашовая эмісія будзе ўжыцьцяўляцца адзіным эмісійным цэнтрам. Але ж не выкананы яшчэ пункт па ўніфікацыі падатковага заканадаўства?!)

Большасьць саюзных эканамістаў лічаць дапушчальным уводжаньне з 2004-га году адначаснага хаджэньня расейскага і беларускага рубля на тэрыторыі Беларусі з разлiку 1 да 70, а зь 1-га студзеня 2005-га году – толькі адзіная грашовая адзінка – расейскі рубель.

У цяперашні час адзін расейскі рубель ацэньваецца ў 67 рублёў. Так што, калі памянёныя прагнозы апраўдаюцца, тады беларускі рубель да канца году зьняцэніцца да расейскага яшчэ на 4,5 працэнты. “Пасьля чаго беларускі “заяц” назаўсёды ўцячэ ў расейскія лясы.”

Пакуль жа беларускаму рублю запраграмавана законам “Аб бюджэце РБ на 2003-і год” зьняцэньвацца да даляру ЗША на 1,4- 1,5 % ў месяц.

Агульнаэўрапейскія тэндэнцыі Беларусі не дагнаць.

Такім вельмі сяброўскім дачыненьням нацыянальных грашовых адзінак Беларусі і ЗША пажадана было б перанесьціся на іншыя сфэры грамадзкага жыцьця двух народаў.

Можа прывязваньне беларускага рубля да эўра было б выгаднейшым, але для гэтага патрэбен доўгі час і аналіз.

Сачыцьмем за сытуацыяй!

***Сяргей Міронаў***

# “Удзячым Богу за сьвятых…”



*Ёсьць у Беларусі мясьціны, пазначаныя Панам Богам – Будслаў і Пінск, Полацак і Наваградак, Нясьвіж і Гародня… Гэтыя мясьціны сталі сьведкамі нараджэньня, ахвярнага жыцьця ці пакутніцкае сьмерці сьвятых, альбо асьвечаныя цудамі і асаблівай духовай магутнасьцю, якія жывілі веру ў час цяжкіх выпрабаваньняў.*

Гарадзенскі касьцёл Найсьвяцейшай Панны Марыі – найстаражытнейшы каталіцкі храм гораду, які выконваў функцыі фарнага касьцёлу некалі квітнелае вольнае магдэбургскае Гародні. Уфундаваў гэты касьцёл Вялікі князь Вітаўт у канцы 14 стагоддзя, таму касьцёл да сёньняшніх дзён і называюць Фарай Вітаўта. Першая Фара была пабудаваная з дрэва і ўражвала веліччу ды хараством, што адлюстроўвала гонар гараджанаў за свой горад у вачох заезджых гасьцей і прыхадняў, якіх багата зьбіраў брукаваны пляц Рынку ў час магдэбургскіх кірмашоў і гарадзкіх фэстаў на ўшанаваньне апекуна Гародні сьвятога Губэрта. Пэўна, ня зблякла тое хараство і праз 200 гадоў, калі ў 1584 годзе ўзрушаны выглядам касьцёлу езуіцкі правінцыял Кампана напісаў у лісьце, скіраваным у Рым, што гэта “найвялікшы і найхарашэйшы касьцёл у Вялікім княстве Літоўскім”.

Праз стагоддзі аблічча Вітаўтавай Фары данесла да нас гравюра Гародні, выразаная нюрнбэргскім майстрам Марцінам Цюндтам паводле арыгінальнага малюнку Ганса Адэльгаўзэра да выданьня “Атляс у гарадоў Эўропы”, які пабачыў сьвет у 1568 годзе.

Старажытны Вітаўтаў храм у 15 стагоддзі асьвяціла найнысьцейшая малітва каралевіча Казімера, унука Ягайлы, сына караля Казімера Ягелончыка і Аліжбэты Габсбургскай, будучага сьвятога каталіцкага касьцёлу. Зачас свайго княжаньня ў Літве, Казімер Ягелончык жыў у Гарадзенскім замку, пабудаваным Вітаўтам. У 1445 годзе сюды, у Гародню, прыбыло да яго з Польшчы высокае пасольства на чале з гнезнаўскім арцыбіскупам Вінцэнтам Катом, які ў замкавай капліцы, ведамай сёньня як Верхняя царква, узьнёс над галавой Вялікага князя Казімера Ягелончыка польскую каралеўскую карону. Пазьней у родны Гарадзенскі замак кароль Казімер Ягелончык накіраваў свайго любага, але хваравітага сына, нашчадка польскае кароны, каралевіча Казімера, з надзеяю, што чыстае паветра Гародні паправіць слабое здароўе юнага каралевіча.

Годны выхаванец славутага храніста ксяндза Яна Длугаша, каралевіч Казімер, вылучаўся добрым і чыстым сэрцам, апекаваўся ўбогімі, часьцяком да позьняе ночы маліўся перад дзьвярыма Фары Вітаўта. У Гарадзенскім вялікакняскім замку каралевіч Казімер памёр 4 сакавіка 1484 году. Але і сёньня адданыя гараджане калі-нікалі сярод стракатага натоўпу сярэднявечнага Рынку, на які глядзела старажытная Фара, заўважаюць летуценны вобраз сьвятога юнака ў чырвонай мантыі, які агарняе сваёй апекаю найтрадыцыйнейшы горад Беларусі.

Кароль Стафан Баторы запрасіў у Гародню, дзе ён пражыў усе гады свайго валадарства на польскім троне, езуітаў, каб яны заняліся тут асьветаю. Ён жа перадаў езуітам плян Гарадзенскае Фары Вітаўта, каб тыя на месцы драўлянага ўзьнесьлі новы, мураваны касьцёл, дзе кароль выказаў волю пахаваць яго. У 1584 годзе двор, сьвятарства і гараджане былі пры ўрачыстым асьвячэньні кутнага каменю пад новы храм. Неўзабаве над Рынкам узьнёс сваю лебядзіную вежу-званіцу мураваны рэнэсансава-гатычны касьцёл, які дзівіў веліччу і хараством.

Унутры храму крыжовыя скляпеньні абапіраліся на крыжы ісьцены, якія ўзмацнялі кантрафорсы, цэнтральны нэф праводзіў да галоўнага алтару ўбольш нізкім прэсбітэрыі з трохкутнаю апсідаю, скіраванай у бок замку. На фасадах актыўны дэкаратыўна-малёўны эфэкт белага на чырвоным, які ствараўся спалучэньнем атынкаваных і пабеленых паверхняў званіцы, аркатуры і контрафорсаў з муроўкай чырвонае цэглы, што адпавядала старажытнай архітэктурнай традыцыі Беларусі. Чатырох’ярусная, з рэнэсансавым купалам званіца мураванага касьцёлу стала галоўнай архітэктурнаю дамінантай вольнага гораду Гародні, уздымаючыся над яго магдэбургскім цэнтрам – брукаваным Рынкам.

Праз 14 гадоў пасьля пабудовы мураванай Фары, у 1600 годзе, майстар-гравёр Тамаш Макоўскі, які працаваў у нясьвіскай друкарні князя Радзівіла, выразаў і адціснуў гравюру з выглядам Гародні, дзе красуе мураваны храм Найсьвяцейшае Панны Марыі, узьнесены на месцы драўлянай Фары Вітаўта.

Амаль два стагоддзі мураваная Фара заставалася галоўным каталіцкім храмам гораду, і ні войны, ні пажары не маглі пахіснуць высока ўзьнесеную над горадам званіцу. На касьцёльныя фэсты ўдзень сьв. Тройцы, на Божае Цела, на сьв. Міхала і Ўнебаўзяцьця Найсьвяцейшае Панны Марыі касьцёл і пляц Рынку запаўнялі велізарны натоўп гараджанаў і гасьцей: працэсіі вернікаў, тэатральныя відовішчы, кірмашы. Пры касьцёле дзеілі брацтвы сьв. Тройцы і Анёлаў-Захавальнікаў. З сродкаў парафіянаў і фундуша каралевы Боны Фарны касьцёл утрымоўваў прытулак сьв. Духу, што стаяў на вуліцы Віленскай, непадалёк ад касьцёлу.

Але травеньскай ноччу 1782 году ад агню, што ўзьняўся ў габрэйскім доме, выгарала значная частка даўнага цэнтру Гародні. Згарэлі ўсе дамы па вуліцы Замкавай. Паводле падлікаў агонь вынішчыў у горадзе 300 дамоў і “касьцёл фарны мураваны, з усім, што ў ім было,” – як напісаў у лісьце да сваёй пані сакратар Ізабэлы Браніцкай з Гародні ў Беласток.

Пасьля гэтага пажару быў складзены цікавы дакумэнт, які патрапіў да мяне ў Віленскім архіве – “Акт візытацыі Гарадзенскага касьцёлу” 1783 году, што зафіксаваў практычна аварыйны стан парафіяльнага касьцёлу Гародні. Згодна з дакумэнтам, рамонту патрабавалі ня толькі муры, дах, слупы, але і “ўвол ава апраўленыя і з жалезнымі кратамі вокны”. На дзіва, як адзначыў візытатар, ксёндз Ежы Эйсмант, у касьцёле захаваліся ўдобрым стане мураваныя хоры з разьбянаю драўлянай балюстрадай, разьбяная амбона з паліхромнымі скульптурамі чатырох эвангелістаў, сталярнай работы хрышчэльня з фігурай Яна Хрышчэньніка, аздобленыя багатай пластыкай алтары. Разьбяны галоўны алтар з Маці Божаю Чанстахоўскай быў апраўлены ў паліхромныя з пазалотай і серабрэньнем статуі Бога Айца і Сына, анёлаў і сьв. Станіслава. Гарадзенскія майстровыя цэхі разьбяроў, кавалёў, сталяроў мелі ў касьцёле свае прысьценкавыя алтары. Вылучаўся хараством алтар шавецкага цэху з абразамі сьв. Агаты і сьв. Казімера.

(заканчэньне на с.11)

# Помста памерлых

## альбо Канчатковы дыягназ

*Выбух хварэньня на сэрозны мэнінгіт страсянуў Гародню. Але прычына хваробы так і ня высьветленая па сёньняшні дзень. Тым часам гарадзкая пагалоска даўно ўжо дала свой адказ на пытаньне аб прычынах хваробы. Аказваецца - гэта зьвязана з рэканструкцыяй стадыёну "Нёман", дзе, нагадаем, раней былі габрэйскія могілкі. Нехта называе такую думку сьведамай дэзынфармацыяй, нехта бачыць у гэтым боскую кару.*



фота REX/Promedia

пад вокнамі шпіталя

### Танцы на касьцях

Сабакі расьцягвалі чалавечыя косьці, чарапы валяліся сярод вуліцы - такую сюррэалістычную карціну мусілі праз цэлыя сакавік-красавік назіраць жыхары вуліц Новая і Чарнышэўскага ў Гародні. Рэч у тым, што разьлеглыя тутэйшыя яры надумалі засыпаць грунтам, які прывозілі з стадыёну "Нёман".

Любасьць цяперашняга кіраўніцтва краіны да спорту ведамая даўно, таму нікога не зьдзівіла пастанова аб рэканструкцыі стадыёну "Нёман", прынятая на найвышэйшым роўні. Заказцам выступіла ўпраўленьне фізычнай культуры, спорту і турызму, а выканаўцам - унітарнае прадпрыемства "Гроднапромбуд". Праект рэканструкцыі распрацаваў інстытут "Гроднаграмадзянпраект". І ўсё добра было б, каб жа... ня тыя могілкі, дзе цяпер ляжыць стадыён... "Калі распачалася праца - мы пачалі знаходзіць чалавечыя косьці, некаторыя знаходзілі нават залатыя зубы", – кажа адзін з працоўных "Гроднапромбуду". Нельга сказаць, што для аўтараў праекту рэканструкцыі гэтыя знаходкі сталіся нечаканасьцю. "Волею лёсу я працаваў у будаўнічым праўленьні, якое збудавала гэты стадыён. Запраўды там раней ляжалі габрэйскія могілкі, але тады гэта праігнаравалі", – кажа Рышард Кацынэль, галоўны інжынэр "Гроднаграмадзянпраекту". Старэйшыя гарадзенцы па сёньняшні дзень успамінаюць, як раўналі зь зямлею тыя клады, а магільнае каменьне клаліў падмурак будучага стадыёну. Успамінаюць таксама і пра марадзераў, ахвочых да габрэйскага золата... Так было ў 1963 годзе, але няшмат зьмянілася ў галовах гарадзенскіх чыноўнікаў, калі грунтам з стадыёну, уперамешку зь людзкімі касьцімі, надумаліся засыпаць сьметнікі. "Спачатку ўсё было нармальна. Яры засыпалі. Але пазьней пайшлі дажджы - і косьці сталі выглядваць з-пад пяску", – расказвае Вікторыя Назарэнка, адна зь мясцовых жыхарак. Людзі абураліся: "Мы гэтулькі часу зьвярталіся да мясцовых уладаў па дапамогу ў справе гэтых яроў! Як пойдзе дождж, дык нельга было па вуліцы прайсьціся - хіба што ў ботах. І вось, дапамаглі нам - цяпер могілкі маем пад бокам!" – бядуе мясцовая пэнсіянэрка. Рэакцыю гарадзенскіх уладаў адгадаць няцяжка. Праблему здумалі проста замоўчваць.

### Тэатар абсурду

"Так! Ну можа адна-дзьве косткі і трапілі туды разам з грунтам, але ня больш", – запэўнівалі ў ўладных габінэтах. Але справа набыла нецікавы для ўлады паварот, калі адзін з жыхароў "праблемнага мікрараёну", Зьміцер Кузаўкоў, захацеў прыбраць расківданыя па вуліцы чалавечыя чарапы. Пра яго знаходку зараз даведаліся журналісты. Зьявіўся артыкул у "Народнай Волі". Потым сюжэт аб "нечаканай знаходцы" паказалі праз АНТ. "Я проста хацеў прыбраць косьці, каб яны не валяліся... Некалі ж гэта былі людзі, таму варта іх і пахаваць па-людзку", – мяркуе дваццацідзевяцігадовы беспрацоўны Зьміцер Кузаўкоў.

Звычайна ў такіх выпадках прынята наракаць на нястачу духоўнасьці і веры ў Бога. Але ў нашым тэатры абсурду гэтыя вінавачаньні проста сьмешныя. Рэч у тым, што адзін з аўтараў праекту рэканструкцыі стадыёну Рышард Кацынэль - адзін зь лідараў Зьвязу палякаў, і да таго ж - апантаны каталік. На мінулым зьезьдзе Зьвязу палякаў менавіта ён прапаноўваў прыняць рэзалюцыю згодна зь якою кожны паляк абавязаны быць каталіком. А тым часам Кузаўкоў, нявернік - я адумысна ў яго пытаўся. І пазьбіраў косьці ён адно таму, бо "не па-людзку гэта". Тое, што не па-людзку для атэіста Кузаўкова, сталалася цалкам нармальна для верніка Кацынэля.

### Эпідэмія

Вось жа, на пачатку мая ў Гародні выбухнуў сэрозны мэнінгіт. Галоўныя сымптомы хваробы - высокая тэмпэратура, боль галавы і ваніты. Дакладная прычына пошасьці пакуль што няведамая. "Мы лічым, што прычынаю сэрознага мэнінгіту ёсьць энтэравірус", – сьцьвярджае Мікалай Кендыш, галоўны лекар Гарадзенскага гарадзкога цэнтру гігіены і эпідэміялёгіі.

Выпадкі хваробы зарэгістраваныя ў розных раёнах гораду і на першы погляд паміж сабою зусім ня лучацца. Найпэўнейшай вэрсіяй гарадзенскія эпідэміёлягі лічаць на сёньня перадаваньне хваробы праз вадаводы. Таму галоўная парада эпідэміёлягаў для гарадзенцаў, якія хочуць унікнуць хваробы - ня піць негатаванае вады. Разам з тым у горадзе працягвае рэалізоўвацца цэлы шэраг адэпідэмійных мерапрыемстваў. На ўсіх вадабраньнях, а іх у Гародні чатыры, уведзена гіпэрхляраваньне вады і ўзмоцнены кантроль за яе якасьцю. Апрача таго карантынавыя і адэпідэмійныя мерапрыемствы праводзяцца ў установах, дзе выяўленыя выпадкі хваробы. "У зьвязку з

# Праўнае збачэнства

## Уплыў савецкай сьведамасьці на праўную культуру беларусаў

*Праўная сведамасьць беларускага народу гістарычна сфармавалася на падставе праўных звычаяў і законаў. Найбольшымі з апошніх былі статуты Вялікага Княства Літоўскага, прынятыя ў XVI стагоддзі. Гэтыя нармацыйныя акты ляжалі цалкам ў эўрапейскай традыцыі права. Адпаведна гэтаму і праўная сьведамасьць беларусаў адпавядала эўрапейскаму роўню. Асобныя нормы статутаў дзеілі нават пасьля далучэньня ВКЛ да Расейскае імпэрыі. Расейскае права пасьля рэформаў цара Пятра І таксама адпавядала эўрапейскім фармальным стандартам, хоць і не слаадбіта кдэспатычнага рэжыму кіраваньня расейскаю краінаю. У 60-х гадох XIX стагоддзя расейскі цар Аляксандар ІІ правёў гэткія глыбокія рэформы ў галіне права і судовага ўладкаваньня, што яны дагэтуль застаюцца ўзорам для сёньняшняе расейскае ўлады, дагэтуль аналізуюцца расейскімі спэцыялістамі ў галіне тэорыі і гісторыі права дзеля дасканаленьня сучаснага расейскага заканадаўства.*




### *Нармаванае збачэнства*

Савецкае права, уведзенае бальшавікамі, наадварот, мела зусім іншую супраць папярэдніх праўных сыстэм існасьць. Яно было настолькі неадэкватным у дачыненьні да рэчаіснасьці, настолькі жорсткім у мэтадах забесьпячэньня сваіх загадаў, што цалком выпала з кантэксту эўрапейскай, і нават расейскай, праўнай культуры. Таму ёсьць патрэба дасьледаваць уплыў савецкага таталітарнага права на сьведамасьць сучасных грамадзянаў Беларусі і адваротную лучнасьць: уплыў савецкай сьведамасьці на сучаснае беларускае права.

Першай адметнаю рысай савецкага права была ягоная нежыцьцёвасьць, неадпаведнасьць патрабаваньням натуральнага, надзённага чалавечага жыцьця. Гэта вынікала з утапічнасьці камуністычнай ідэалёгіі. З таго, што камунізм ёсьць недасягальнаю ў рэчаіснасьці мараю, папросту, казкаю. Казку нельга зьдзейсьніць у жыцьці. Нават, калі скарыстаць сама жорсткія сродкі для прымусу людзей у мэтах ўвасабленьня казкі ў жыцьцё.

Адсюль вынікае знакаміты савецкі неўміручы праўны нігілізм, які дагэтуль складае найістотнейшую часткy праўнае сьведамасьці беларусаў. Калі закон не адпавядае патрэбам жыцьця, інтарэсам людзей, то навошта яго выконваць? Так думае ўсякі чалавек, пастаўлены ў умовы, калі законы замінаюць ягоным інтарэсам.

Чаму нельга вольна гаспадарыць на сваёй зямлі? Чаму нельга свабодна прадаць прадукту свае працы? Чаму нельга на гэты конт выказаць свае думкі? Чаму ўсё гэта падпадае пад склад злачынства: такога як спэкуляцыя, прыватнае прадпрыманьне, контрэвалюцыйная прапаганда? Кожнаму відавочна, што здабываньне сродкаў для існаваньня ня можа быць злачынствам, бо тады спыніцца само жыцьцё. Выказваньне думак таксама нельга забараніць, іначай спыніцца прагрэс.

У выніку нашыя грамадзяне падышлі да казачнага, утапічнага савецкага права бальшавікоў па-народнаму проста. Яны ягоне выконвалі альбо парушалі штодзённа ды ў масавым маштабе. І ня бачылі ў гэтым нічога кепскага. Што цалкам зразумела: лепш быць жывым, чым законлівым.

Тэарэтык камунізму Маркс казаў, дзей капіталіст прысабечвае дадатковы (прыбавачны) прадукт, які напрацавалі рабочыя і сяляне. Савецкія камуністы, якія на словах змагаліся з капіталістамі, на справе адбіралі ўпрацоўных ня толькі дадатковы прадукт, яны адымалі ў іх нават тое, што патрэбнае было для ўзнаўленьня вытворчасьці і рабочае сілы. Яны ператварылі савецкіх працаўнікоў у рабоў, якія працавалі ў калгасах за гэтак званыя працадні-“палачкі”, на якія ім выдавалі дробязныя прадукты земляробства. А маглі і не выдаваць. На заводах заплата не пакрывала выдаткаў на харчаваньне і жытло для рабочых.

Адным словам, дзяржава нахабна абкрадала грамадзянаў. Для абароны нарабаванага дзяржава прыняла законы, паводле якіх расстрэльвала сваіх грамадзянаў за зразаньне жытніх каласкоў ці выкарыстаньне ў гаспадарцы пары ўжываных цэглаў. У адказ грамадзяне не лічылі, і дагэтуль ня лічаць, немаральным абкраданьне дзяржавы. Галоўнае - не папасьціся. У гэтым усе салідарныя. Гэтае стаўленьне нашыя работнікі перанесьлі і на дачыненьні з сучаснымі прадпрымальнікамі, якія дзяруць скуруз працоўных не горш за бальшавікоў. Украсьці збожжа з фэрмы, жалезіну з цэху, бэнзын з машыны, шмат сала ці мяса з сталоўкі, кавалак тканіны з атэлье – гэта не злачынства, а толькі стыхійнае пераразьмеркаваньне раней украдзенага, вынік усьведамленьня народам гістарычнага досьведу дзеяньня савецкай эканамічнае сыстэмы, мусовасьць дзеля выжываньня.

Тым часам украсьці ўсуседа – вялізарны грэх. Які асуджаецца ўсімі. Нячысты на руку сусед, супрацоўнік, сваяк – бясспрэчны злодзей. Такога трэба бязьлітасна караць. Аднак, калі справа датычыць дзяржаўнае, калгаснае, прадпрымальніцкае маёмасьці, запавет “не крадзі” перастае дзеіць.

### *Карнікі*

Адсюль вынікае наступны, другі, фэномэн нашай праўнае сьведамасьці – нянавісьць да супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Іх успрымаюць у якасьці карнікаў, якія караюць людзей не за нейкую канкрэтную шкоду для грамадзтва, а за прыналежнасьць да рабскага племя. Усё грамадзтва дзеліцца на дзьве супраціўныя часткі: парушальнікі права і ахоўнікі права. Звычайны грамадзянін ня можа ўявіць, што дзяржава, закон, “мент” будуць бараніць ягоныя інтарэсы. Бо навошта? Закон жа прыдуманы бальшавікамі не для абароны людзей, а для трыманьня іх у слухмянасьці.

Былы прадстаўнік СССР ў Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў неяк расказваў аўтару гэтых радкоў як у Нью-Ёрку на сьвята Раства Хрыстовага кіроўцы машын, якія праязджалі праз дарожны паліцэйскі пост, пакідалі дзяжурнаму паліцаю падарункі: віскі, закуску, цацкі. Ці можам мы ўявіць падобнае ў Беларусі? Законі інтарэсы нашых грамадзянаў даўно разышліся і ядна цане зьбіраюцца.

Нянавісьць да збачэнскага права беларус пераносіць на начальства, як на ініцыятара і носьбіта такога права. Кожны начальнік, як мяркуе наш грамадзянін, мае, з аднаго боку, змогу націснуць на простага чалавека з дапамогаю права, а з другога - націснуць насуперак праву, калі раптам закон бароніць (не такая ўжо частая справа) простага чалавека. Начальства ў нас

стаіць па-за межамі права. Вось чаму просты беларус так ухваляе змаганьне вышэйшага начальства з начальствам ніжэйшым, у тым ліку праўнымі сродкамі. У тое, што перад законам усе павінны быць і ёсьць роўнымі, беларус не паверыць ніколі. Але яму прыемна, калі беспакаранасьць яго начальніка спыняецца начальнікам вышэйшым.

Беларус думае так: мяне, калі я пападуся за крадзеж, пакараюць. А начальнік крадзе фактычна беспакарана. То няхай і начальнік разпораз пацерпіць. Колькі разоў даводзілася чуць наступнае разважаньне. Злоўжываньні ў уладзе – рэч натуральная, бо, каб мы самыя мелі ўладу, то гэтак сама, а то і болей, кралі б. Працаваць і зарабляць, а ня красьці, каб забясьпечыць прыстойнае існаваньне,- такую мажлівасьць беларус не ўяўляе ў прынцыпе.

### Закон і палітыка

Зь першых двух выступае і трэці фэномэн праўнае сьведамасьці сучасных беларусаў – грэбаваньне законам з боку дзяржаўных службоўцаў, праваахоўнікаў і судовых чыноў. У свой час камуністы заявілі, што закон ёсьць выражэньнем палітыкі партыі. Вынікала, што, калі закон супярэчыць палітыцы партыі, то павінна ўжыцьцяўляцца палітыка, а не закон. Так і павялося: усякая палітычная альбо асабістая дамэтнасьць чыноўніка пераадольвала ўсе законы. Савецкі і сучасны беларускі чыноўнік ня лічыць сябе скаваным такой фармальнасьцю як закон.

Савецкае права ёсьць нармаваны генацыд. Людзі тут падлягаюць адказнасьці не за канкрэтную віну, а на падставе нейкіх сацыяльных прыкмет: паходжаньня, маёмаснага стану, веравызнаньня, палітычных паглядаў і г.д. Расейскі юрыст Цільле сьцьвярджаў, што супрацоўнікі савецкіх праваахоўных органаў выступаюць фактычнымі выканаўцамі-кілерамі, якім даюць загады-заказы палітыкі. Адсюль псыхалёгія савецкіх праваахоўнікаў – за грошы і пад патранажам (пад "дахам") улады яны гатовыя выканаць хоць які загад-заказ, незалежна ад таго, адпавядае загад закону, ці не.

Нашыя грамадзяне не ўспрымаюць права сваеі дзяржавы, бо яно замінае ім жыць. І замінае ў самы пачварны, самы жорсткі, самы гвалтоўны і бязглузды спосаб. Здавалася б, яны павінны жадаць паслабленьня праўнага ўціску. Ажно не, наадварот, яны вітаюць найсуровейшыя меры навядзеньня парадку, уведзеныя беларускай дзяржавай у сярэдзіне 90-х гадоў XX стагоддзя. Такія, як змаганьне з карупцыянэрамі і валютнікамі, страйкоўцамі ды апазыцыянэрамі, заходнімі інвэстарамі і ўсходнімі алігархамі.

Гэтым грамадзяне нібыта кажуць: з намі інакшай нельга. Праўны нігілізм і праўны фэтышызм зьліліся ў праўнай сьведамасьці беларусаў у адно. Раз грэбуюць законам усе, то навесьці парадак, лічаць беларусы, бяз праўнага насіленьня ў самых жорсткіх формах - нельга. Ніхто не задумваецца, што можа існаваць закон справядлівы, які адпавядае інтарэсам асобы і грамадзтва. Закон, які ўсе будуць выконваць ня дзеля страху, а таму, што гэта будзе спрыяць інтарэсам усіх грамадзян.

Каліб'ядноўваць усе фэномэны савецкага права, якія дагэтуль уплываюць на сьведамасьць беларусаў, то іх належала б зьвесьці да супраціву двух кірункаў. З аднаго боку, мэтна працуе ўтапічны кірунак, які спрабуе зьмяніць натуральную прыроду чалавека і пабудаваць казачнае грамадзтва (камунізм, рынкавы сацыялізм ды інш.). Утапічнаму кірунку праціўляецца рэальнае жыцьцё чалавека, якое ў сваіх штодзённых праяўленьнях ігнаруе і разбурае нежыцьцёвае, збанэнскае права і таталітарныя мэтады ўжыцьцяўленьня ўтапічнага закону.

Выснова адна: жыцьцё пераадолее хоць якое збачэнства.

*Сяргей Самасей*


крыж на месцы Фары, зьнішчаны ўладамі

# "Удзячым Богу за святых…"

(заканчэньне, пачатак на с. 7)

Большяк стагоддзе пры касьцёле дзеіла школка, але і яе будынак згарэў у час пажару, і ў 1783 годзе школка здымала "кут у пробашча".

Цяжкі час апошніх гадоў Рэчы Паспалітай і далейшы каляніяльны лёс Гародні не дазволілі заняцца аднаўленьнем рэнэсансавай Фары. У 1793 годзе небясьпечны стан будынку старажытнай Фары прымусіў перанесьці парафіяльную службу ў езуіцкі касьцёл сьв. Францішка Ксавэра, што насупраць праз пляц Рынку. Пра стан пакінёнага касьцёлу вымоўна гаворыць малюнак, зроблены графіняй Ганнаю Патоцкай з Тышкевічаў у 1795 годзе пры наведваньні Гародні, дзе мы бачым зруйнаваную сьвятыню.

Расейская імпэрыя, у склад якой увайшла Гародня пасьля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, каб узмацніць уплыў на мясцовае насельніцтва, якое яна далучыла да грона сваіх падданых, актыўна зрэалізоўвала палітыку прасоўваньня расейскага праваслаўя на тэрыторыю Беларусі. Шэраг касьцёлаў і кляштараў зь іх маёмасьцю і нерухомасьцю пераводзіла да праваслаўных ужо на мяжы 18 і 19 стагоддзяў. У 1804 годзе старажытную Фару расейскія ўлады перадалі расейскай праваслаўнай царкве. 7 жніўня 1807 году тут была асьвечаная царква з двума стальцамі.

Праз усё 19 стагоддзе будынак Вітаўтавай Фары часьцяком рамантавалі і перараблялі, каб унікнуць неправаслаўнага выгляду храму. Асабліва дасталося даху, які выдаваў старажытную гатычную традыцыю. Зьмянялі вышыню даху, замест дахоўкі паклалі бляху, але адпаведнага эфэкту не было. Пра выгляд касьцёлу ў 80-ыя гады 19 стагоддзя вымоўна гаворыць гравюра Напалеона Орды з выяваю тагачаснае Фары.

Ад 80-х гадоў 19 стагоддзя высокія праваслаўныя саноўнікі сталі ўздымаць пытаньне пра перабудову Сафійскага сабору, які дзеіў у Фары ад 1857 году, згодна з праваслаўнымі ўзорамі. Але справа зацягнулася. Толькі пасьля пажару 1892 году, калі практычна быў зьнішчаны галоўны храм, згарэла званіца і разьбіліся званы,- пачалі рупіцца пра перабудову, якая распачалася ўвесну 1896 году і завершылася ў 1898. 28 Сакавіка 1899 году храм асьвяцілі, а 24 студзеня 1900 году тут урачыста адкрылі Гарадзенскі Катэдральны Сафійскі сабор.

У тым жа годзе пры храме адкрылі двухклясную жаночую і аднаклясную мужчынскую прыхадзкія школкі, якім надалі імя графа М.Мураўёва, ведамага ў Беларусі, як Мураўёў-вешальнік, а палац Масальскага, што месьціўся побач, на вуліцы Замкавай, перадалі Сафійскаму Праваслаўнаму брацтву, якое разьмясьціла тут чарнасоценны Саюз рускага народу.

Толькі ў 1919 годзе храм вярнуўся да каталікоў і стаў выкарыстоўвацца, як гарнізонны касьцёл. Пасьля дзьвюх перабудоў паводле праектаў А.Генэбэрга ў 1923 і А.Сасноўскага ў 1935 гадох будынак набыў рысы раманска-гатычнай архітэктуры.

Пасьля вайны Фара стала аб'ектам навуковых дасьледаваньняў. На яе як на ўнікальны помнік архітэктуры зьвярнулі ўвагу ведамыя савецкія дасьледнікі В. Кудрашоў і А. Квітніцкая. Але нягледзячы на вылучную архітэктурную каштоўнасьць помніка, пастановаю № 213 ад 8 сакавіка 1961 году "Аб зносе аварыйнага будынку вайсковага касьцёлу на Савецкай плошчы", касьцёл быў зруйнаваны ў ноч 28 на 29 лістапада 1961 году. Імёны тых, хто прыняў гэтае дзікунскае зьмеркаваньне адкрыў і надрукаваў у 1990 годзе А.Мілінкевіч.

У 80-90 гады 20 стагоддзя старажытная Фара стала вывучацца з мэтай архітэктурнага адзначэньня і ўшанаваньня месца, на якім стаяў касьцёл. Тады помнік дасьледавалі беларускія дасьледнікі Т.Габрусь, Ю. Гардзееў, У. Дзянісаў, Т. Маліноўская, А. Мілінкевіч, А. Трусаў, С. Шайко. На жаль, тады гэтая ідэя не зрэалізавалася, але шэраг публікацыяў, выступы на радыё і тэлевізіі абудзілі памяць і гонар гарадзенцаў у выніку чаго на месцы былой Фары паставілі крыж, які ўлады пасьпяшаліся прыбраць. Нягледзячы на такую пазыцыю ўладаў, на месцы Фары Вітаўта на Дзяды зноў і зноў тут зьяўляюцца крыжы і запальваюцца зьнічкі, пры якіх моляцца гараджане.

Старажытная Фара Вітаўта – гэта ня толькі помнік архітэктуры, ня толькі незаменны кавалачак нашай культурнай традыцыі, гэта – наша духовая памяць, прымаючы якую мы аддаем пашану тым, хто дбаў пра духовую спадчыну народу, хто асьвяціў нашую зямлю сваім жыцьцём, хто пераказаў нам моц веры і любові, каб і мы сталіся дзецьмі Айца Нябёснага і наўслед за Янам Паўлам II прамовілі: "Дзякуем Богу за сьвятых, якія дапамагаюць нам быць цьвёрдымі і пільнавацца веры! Праз іх дзеіць Дух Праўды, які ад Айца паходзіць".

*Т. Кавэцкая*

# Беларусы Беласточчыны ў выбарах пасьля 1989 году




Сьвяткаваньне ўгодкаў БНР у Беластоку, 1991 год

*„СП" працягвае рэтраспэктыўны агляд удзелу беларусаў Беласточчыны ў выбарах рознага роўню ў Польшчы апошніх пятнаццаці гадоў. Упэўнены, што аналіз Міхася Андрасюка будзе цікавы ўсім, хто цікавіцца грамадзка-палітычным жыцьцём беларусаў у блізкім замежжы. Як заўсёды, захоўваем стылі і правапіс аўтара.*

### Парляменцкія выбары 1991 і 1993

Ужо ў лістападзе 1990 га года Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне прыняло пастанову аб самастойным удзеле ў бліжэйшых парляменцкіх выбарах. Адбыліся яны 27 га кастрычніка 1991 га года. Насуперак ранейшым намаганням, зараз таксама беларусы не пайшлі да выбараў адным камітэтам. Традыцыйна ўжо беларускае не спрацавала з праваслаўным. Яўген Чыквін, лідар Праваслаўнага Брацтва паклікаў Выбарчы камітэт праваслаўных, як кааліцыю: Праваслаўнае барацтва, Беларускае грамадска-культурнае таварыства, Саюз украінцаў Падляшша. Другі камітэт Беларускі выбарчы камітэт склалі Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне, Беларускае аб'яднанне студэнтаў і Літаратурнае аб'яднанне „Белавежа".

„Свая зямля, хлеб і вера" пад такім лёзынгам Беларускі выбарчы камітэт пайшоў да выбараў. „Ці жыць без сваёй зямлі? Вядома, можна, але быцьцё гэтае як таго парабка ў панскім двары. Працаваць і есці будзеш, ды ўсё не на сваім і не сваё. Ці магчымы свой хлеб без сваёй зямлі? Так ёсьць, і можа быць: есці хлеб з несваёй зямлі. Але тады твой лёс не будзе тваім, а толькі ласкава адпушчаным табе. Ці вера свая без сваёй зямлі й свайго хлеба можа быць? Тут ужо ўсё ясней яснага: не." Гэта цытата з выбарчай лістоўкі Беларускага камітэта. Камітэт зарэгістраваў сваіх кандыдатаў у сямі выбарчых акругах: горад Варшава, ваяводства слупскае і кашалінскае, ваяводства гданскае, ваяводства эльблёнскае і альштынскае, ваяводства бяльска-падляскае і сядлецкае, ваяводства вроцлаўскае і, вядома, у акрузе беластоцка-сувальскай.

Такім чынам беларусы задумалі збіраць галасы і ў другіх рэгіёнах Польшчы. Усё ж такі, якраз у гэтых выбарах Беларускі камітэт атрымаў малую падтрымку 7859 галасоў. Самую значную колькасць 4435 у беластоцка-сувальскай акрузе. Але таксама амаль дзве тысячы ў кашалінскім і слупскім ваяводствах. У апошніх акругах галасавалі за нашых кандыдатаў да чатырох сотняў асоб. Прыкладова ў Гданьску 379, а сама менш у Вроцлаве 161 голас.

Выбарчы камітэт праваслаўных канкурэнт беларускаму набраў 13788 галасоў і лідэр камітэта Яўген Чыквін атрымаў соймавы мандат. Кандыдат Беларускага выбарчага камітэта ў Сенат Ян Чыквін набраў за дваццаць сем тысяч галасоў, больш за кандыдата Праваслаўнага камітэта, больш таксама за беларуса Сяргея Плеву які балаціраваўся ад левых дэмакратаў, усё ж такі гэтая колькасць аказалася недастатковай у параўнанні да кандыдатаў, за кім стаяў каталіцкі электарат. Выбарчая кампанія ў 1991 годзе праводзілася жменькай энтузіястаў. Не спрыялі паспяховай агітацыі сціплыя фінансы, адсутнасць сродкаў транспарту, а таксама факт, што беларусы не змаглі да гэтых выбараў задзіночыць сваю сілу. І ў рэшце рэшт упершыню спрацаваў палітычны капітал Владзімежа Цімашэвіча, накоплены падчас апошніх прэзідэнцкіх выбараў. Цімашэвіч набраў 54 000 галасоў, у значнейшай колькасці беларускіх.

Варта сказаць, што ніколі пазней беларускія выбарчыя камітэты не выйшлі за падтрымкай паза мяжу Падляшша. Выбраны ў кастрычніку 1991 года Сойм працаваў няпоўныя два гады. Па прычынах, якія не маюць якраз дачыненьня да нашай тэмы, прэзідэнт Валэнса развязаў парлямент. Гэта абазначала датэрміновыя выбары ў верасні 1993 года.

Беларускія арганізацыі, а таксама Праваслаўнае брацтва, пайшлі да гэтых выбараў у супольнай кааліцыі. Гэта павысіла колькасць галасоў да дзесяці тысяч, на тры тысячы больш у параўнанні да набраных у папярэдніх выбарах, аднак здабыць соймавы мандат не ўдалося. Сімпатыі беларускага электарату канчаткова замацаваліся на асобе Цімашэвіча. Яўген Чыквін, які паклікаў Праваслаўны выбарчы камітэт і балаціраваўся ў Сенат, набраў аж пяцьдзесят адну тысячу галасоў аднак нязначна прайграў з прадстаўніком СЛД і кандыдаткай Аб'яднання каталіцкіх сем'яў.

### Выбары ў самакіраванне 1994

9 чэрвеня 1994 га года адбыліся выбары ў самакіраванне. У гэтых выбарах не было беларускага камітэта, які б спалучаў выбарчую акцыю. У паасобных гмінах беларусы пайшлі да выбараў у розных кааліцыях абапіраючыся на мясцовыя ўмовы. І так: у Беластоку Беларускі выбарчы камітэт знайшоўся ў камітэце праваслаўным гэтая кааліцыя набрала 5015 галасоў і атрымала тры мандаты ў Раду горада; Беларускае грамадска-культурнае таварыства прыступіла ў Самаўрадавую кааліцыю „Левіца", аднак прадстаўнік Таварыства не атрымаў мандат у гарадскую раду.

У Бельску Падляскім заснавалася „Бельская кааліцыя". Склалі яе Беларускі выбарчы камітэт, Саюз левых дэмакратаў, Унія працы, Саюз украінцаў Падляшша і Аб'яднанне польскіх настаўнікаў. У рэзультаце Кааліцыя ўзяла 18 з 28 мандатаў у Раду горада, а таксама паклікала бурмістра стаў ім Андрэй Сцепанюк ад Беларускага выбарчага камітэта.

У Гайнаўцы Беларускі выбарчы камітэт пайшоў супольна з СЛД як кааліцыя „Дэмакратычны выбарчы камітэт". Тут таксама кааліцыя перамагла, здабываючы, як і ў Бельску 18 з 28 мандатаў, у рэзультаце Старшынём Рады быў выбраны прадстаўнік Беларускага камітэта Якуб Астапчук.

У гміне Гарадок, як і чатыры гады раней, перамог у выбарах камітэт Беларускага дэмакратычнага аб'яднання, прадаўжаючы кадэнцыю свайго войта Яўгена Семянюка на чарговыя чатыры гады.

У апошніх гмінах беларусы пайшлі да выбараў як незалежныя кандыдаты, або прадстаўнікі польскіх партыяў.

*(працяг будзе)*



*Ваўкавыскі раён, як і іншыя рэгіёны Гарадзеншчыны, багаты сваёй архітэктурнаю спадчынай. Нават тое, што ацалела пасьля віхураў рознага кшталту захопніцкіх войнаў, пасьля руйнаваньня савецкай уладай храмаў і рабаваньня прыватна-ўласных забудоў, уражвае падарожніка.*

Асабліва цікавай падаецца гісторыя прыватных уладаньняў сядзібнага тыпу. Нягледзячы на скрайне занядбаны стан бальшыні зь іх сёньня, сучасны вандроўнік будзе захоплены, уявіўшы колішнюю веліч. Найярчэйшай пэрлінай у гэтым сэнсе падаецца сядзіба ў **Красках**. Належала яна спачатку Булгарынам, а ад сяр. XIX ст. да 1939 г. роду Сегенеў, якія да пачатковай драўлянай пабудовы дабудавалі ў 1905 г. мураваны двухпавярховы палац. Увесь палацава-паркавы комплекс займае каля 6 гектараў. Яшчэ адна адметная сядзіба на беразе рэчкі Зяльвянкі існуе ў **Падароску**. Пабудаваная яна была ўканцы XVIII ст. найверагодней Канстанцінам Чачотам, альбо ранейшымі ўладаньнікамі Грабоўскімі. Тэрыторыя колішняга маёнтку, апошнім уладаньнікам якога, перад нашэсьцем саветаў, быў Раман Бохвіц, аточаная мураванаю агароджаю з цаглянаю брамай. Іншыя ведамыя сядзібы ваўкавыскай зямлі: **Тэалін** (сяр. XIX ст.), колішняе валоданьне графа Струцінскага; **Рэпля** (захаваўся часткова парк другой пал. XIII ст., закладзены ў маёнтку Патоцкіх); **Гнезна**. У **Хацькоўцах** была сядзіба Ельскіх; у **Росі** ў палацы Адама Браніцкага была калекцыя старажытных рэчаў; у **Косіне** ў XIX ст. – хатні музэй з археалягічным зборам.



сядзіба ў Красках

Найцікавейшыя археалягічныя помнікі ў раёне - гэта комплексы ў **Краснасельскім** і **Карпаўцах**, дзе былі старажытныя крэмнездабыўныя шахты, а таксама сам раённы цэнтар – у старажытным **Ваўкавыску**, жыхары якога будуць сьвяткаваць тысячныя ўгодкі гораду ў 2005 годзе, былі тры ўмацаваныя паселішчы (замкі): Швэдзкая гара, Замчышча, Муравельня. Гэтыя месцы цяпер - археалягічныя помнікі. Да скарбаў Ваўкавышчыны можна залічыць і дзьве жыватворныя крыніцы – у **Краснасельскім** і **Мінеўшчыне**.

Велічным хараством вылучаюцца хрысьціянскія храмы рэгіёну. Пералічым толькі мураваныя храмы, якія маюць асаблівую адметнасьць. Гэта Вацлаваўскі касьцёл ў **Ваўкавыску** (1846-48), Троіцкі ў **Шылавічах** (1907-14, пабудаваны замест драўлянага храму 1600 г.), касьцёл Найсьвяцейшага Імя Марыі ў **Вярэйках** (1848), Сьв. Міхала Арханёла ў **Гнезьне** (пабудаваны каля 1524 г. уладаньнікамі мястэчка Янам і Альжбэтай Шамятовічамі), Яна Хрышчэньніка ў **Воўпе** (1773, пабудаваны біскупам Янам Непамукам Касакоўскім на месцы касьцёлу XVI ст., захоўваецца драўляны аўтар 1-й пал. XVII ст., фундатарам якога быў падканцлер Казімер Лявон Сапега, сын Льва Сапегі), Петрапаўлаўскі касьцёл у **Ізабэліне** (1778, быў пабудаваны графам Грабоўскім як кальвінскі збор), касьцёл Сьв. Яна Хрышчэньніка ў **Мсьцібаве** (1910-19), Троіцкі ў **Росі** (1852-56, захоўваецца цудатворны абраз XVII ст, які перанесьлі з капліцы ў вёсцы **Мачульна**. Да пераліку варта дадаць сёньняшнія праваслаўныя храмы: у **Росі** – Троіцкая царква (1912, захоўваецца абраз Маці Божая Адзігітрыя мяжы XVII-XVIII ст ст.), у **Кузьмічох** (паміж 1840-50, раней была каталіцкаю капліцаю), у **Воўпе** – Петрапаўлаўская царква (1859, узьведзеная будаўніком Вайнынскім), Міхайлаўская царква ў **Ізабэліне** (кан. XVIII ст.). У **Ваўкавыску** была драўляная Петрапаўлаўская царква (кан. XII ст.), якая да кан. XIX ст. заняпала. Зараз у горадзе ёсьць Мікалаеўская царква (1874), будуецца новы праваслаўны сабор.



сядзіба ў Падароску



касьцёл у Ізабэліне



касьцёл у Ваўкавыску

***Падрыхтаваў Уладзімер Хільмановіч, фота аўтара***

# Аўтару зборніка – 93 гады!

**Новая кніга Апанаса Цыхуна мае назоў “Пройдзеныя шляхі-пуцявіны”. Тут зьмяшчаюцца запісы, успаміны, аўтабіяграфія. Нехта з чытачоў хмыкне гіранічна: ці мала такіх зборнікаў пабачыла сьвет? І хто помніць пра іх аўтараў, тым больш пра зьмест?**

Апанас Пятровіч Цыхун – асоба надзвычай сьціплая, як і кожны запраўдны Беларус. Ніколі нікому ў вочы ня лез. Рабіў сваю справу як настаўнік, дырэктар васьмігодак, інспэктар Гарадзенскага раённага аддзелу народнай асьветы. Мала хто ведаў, што гэты чалавек – апантаны краязнаўца. За час ездаў і паходаў па родных мясьцінах пакрысе назапашваў фактычны матэрыял. Нядаўна выйшла першая брашура, краязнаўча-біяграфічны нарыс “Акадэмік з вёскі Лаша Я.Ф.Карскі” (1992). Уласныя вершы і празаічныя творы зьмясьціў у зборніку “Легенды і балады Гродзеншчыны” (1995). Усё жыцьцё запісваў беларускія народныя песьні Гарадзенскага раёну, якія зьмешчаныя ў кнізе “Песні з народных глыбіняў” (2000).

У новым зборніку Апанас Пятровіч пазначае асноўныя вехі свайго жыцьця. Пачынае аповяд з роднае вёскі Кунцаўшчына, дае гістарычную рэтраспэктыву гэтай зямлі. Адзначае, што ў тых мясьцінах бывала Эліза Ажэшка і на падставе тамтэйшых падзеяў напісала аповесьць “Дзюрдзі”.

Апанас Цыхун ведае свой радавод да чацьвёртага калена. Ці можа пахваліцца гэтым кожны з нас? Пацісьнем плячыма, разьвядзем рукамі, маўляў, няма часу займацца вывучэньнем. А вось чалавек далёка ня першай маладосьці знайшоў архівы, бібліятэкі, удзячных суразмоўцаў. Знойдзеныя цікавосткі, пачутае старанна занатаваў.

З успамінаў укладзены ўвесь зборнік. Уласная біяграфія шчодра населеная ня толькі людзьмі роднымі і блізкімі, але і тымі, што пакінулі сьлед у памяці Апанаса Пятровіча. У Лашанскай пачатковай польскай школе ўпершыню даведаўся, што тут некалі працаваў настаўнікам бацька акадэміка Яўхіма Карскага - вучонага з гэтае вёскі.

Далей навуку Апанас спасьцігаў у польскай сямігодцы, Гарадзенскай польскай настаўніцкай сэмінарыі. Давучыцца не ўдалося. Прыйшла позва ў войска. Служыў артылерыстам у Вільні. Пасьля дэмабілізацыі, ажаніўшыся, працаваў на гаспадарцы.

Апанас Пятровіч – добры апавядальнік. Яго памяць выдатна захавала імёны і прозьвішчы, найдрабнейшыя падзеі. Здавалася б, ну што можна расказаць пра дробнага гандляра, габрэя Іршку, што зь мястэчка Індура? Але праз гэтую асобу бачыцца нам даваенная жыцьцё мясцовага габрэйства наагул. З кніжкі можна даведацца пра дзейнасьць гурткоў Беларускай сялянска-работніцкай Грамады, выступленьне ў мястэчку Алекшыцы лідара БСРГ Браніслава Тарашкевіча, якога сяляне не далі арыштаваць паліцыянтам. Кірмаш у мястэчку Луна – яшчэ адна жывая карцінка “з натуры”.

Апанас Цыхун браў удзел ў абароннай вайне 1939 году ў час нападу фашысцкае Германіі на Польшчу, бараніў Варшаву, трапіў у палон да гітлераўцаў. Паводле савецка-нямецкага пагадненьня польскіх салдат, якія нарадзіліся на далучанай да СССР тэрыторыі, вярталі Савецкаму Саюзу. Калі Апанас Цыхун пачуў, што вязуць зноў у лягер, ця пер ужо савецкі, то ўцёк з эшалёну. Баец-вартавы не страляў…

З надыходам Савецкай Арміі як настаўніка ў войска не ўзялі. У 1944 годзе пачалася пэдагагічная работа. Вярнуўся з-пад Кёнігсбэргу брат Іван. Без нагі, зусім слабы. Але не было спакою і Апанасу. Работнікі КДБ Шапяпін і Іваноў арыштавалі яго як шпіёна, якога нібыта скінулі на парашуце. Такіх “шпіёнаў” было затрымана шмат. Гэта былі палякі, якія хаваліся ад прызыву ў Савецкую Армію.

Сардэчны боль Апанаса Цыхуна – родная мова. Ён бачыў, як яе перасьледавалі даваенныя польскія ўлады, пасьля савецкія, асабліва ў 50-я -70-я гады мінулага стагоддзя. Аўтар прыкладае табліцу школаў Гарадзенскага раёну, якія былі без прычыны пераведзеныя на расейскую мову выкладаньня.

Успаміны чалавека, які мае вельмі шаноўны век, заўсёды каштоўныя. Калі перагорнутая апошняя старонка кнігі, адчуваеш, што дакрануўся да мінулага, уваччу відкі пабачыў тое, аб чым піша Апанас Цыхун – чалавек таленавіты і назіральны, які добра ведае патрабаваньне мэмуарнай літаратуры: толькі праўда праз уласнае “я”.

***Антон Лабовіч***

# Беларускія “донары” ў Францыі

*заканчэньне, пачатак на с.13*

сьмяротнае кары. Перад дэсантам у Беларусь, у сакавіку 1951 году, Янка стаў сябрам рады БНР і ўпаўнаважаным прадстаўніком ураду БНР. Пасьведчаньне ў Парыжы яму ўручыў на той час Прэзыдэнт БНР Мікола Абрамчык. Кажуць, што ў Францыі захоўваецца і архіў БНР. З Парыжам зьвязаны таксама лёс іншых прэзыдэнтаў і сябраў Рады БНР, у тым ліку - Івонкі Сурвілы. Вітаўт Кіпель у сваёй кнізе “Беларусы ў ЗША” зазначае, што соткі беларусаў служылі ў амэрыканскім войску ў час другой сусветнае вайны. Гэтая тэма яшчэ чакае гісторыкаў-дасьледнікаў.

Пра герояў-беларусаў паведамлялі і амэрыканскія газэты. Іван Радзюковіч зь Меншчыны быў адным зь першых, хто высадзіўся на берагох Французскай Нармандыі 6 чэрвеня 1944 году пры адкрыцьці другога фронту. Героем вайны быў Дж. Асіпук. Адзначыўся і Майкл Кліменка. Уладзімер Каваленка быў узнагароджаны найвышэйшым крыжам Вайскова-Паветранага Флёту, Мікалай Арэшка атрымаў Кангрэсавы мэдаль. Геройскай сьмерцю загінуў у Францыі Вікеньці Прост, родам з пад Маладэчна. Геройскай сьмерцю загінулі Д.Уладыка, Б.Старадуб, А.Русецкі, А.Саўчук і шмат іншых.

Беларусы змагаліся з фашызмам на усіх франтох вайны. У 1945 годзе ў Парыжы пачала выходзіць беларуская газэта “Беларускія навіны”. Яна была крыніцаю палітычнае інфармацыі для беларускай дыяспары ў Заходняй Эўропе і зьмяшчала абвесткі аб шуканьні родных і блізкіх у ЗША.

Парыжанамі былі Пачобут-Адляніцкі, член-карэспандэнт Французскай акадэміі навук, Наркевіч-Ёдка і першая ўсьвецежанчына-прафэсарка Зоф’я Кавалеўская, Альфрэд Ромэр і мастак, асьветнік Эдвард Паўловіч, які тут выдаў брашуру “Колькі слоў ліцьвіна”. Жыў у Парыжы і вымушаны эміграваць Міхал Андрыёлі, былы паўстанец і мастак. Па вяртаньні на Бацькаўшчыну эмігрант зноў пакараны царом. Пазьней наш зямляк стане настаўнікам расейскіх мастакоў В. і А. Васьняцовых. У Францыі жыў і працаваў ведамы францускі паэт Гём Апалінэр з роду Кастравіцкіх, яго блізкі сваяк - беларускі паэт Карусь Каганец. Тутэйшае прозьвішча паэта засьведчана на помніку могілак Пэр-Ляшэз. З Францыяю зьвязаны лёс Канстанціна Ельскага і Мікалая Судзілоўскага. Першы ведамы як выдатны падарожнік і заоляг, дасьледнік Французскае Гвінэі ў Паўднёвай Амэрыцы. Мікалай Судзілоўскі добра ведамы перш-наперш як рэвалюцыянэр і палітык, які стане нават прэзыдэнтам Гавайскіх астравоў. За сваё кіпучае жыцьцё ён пасьпее быць удзельнікам грамадзкіх рухаў Расеі, Польшчы, Францыі, Англіі, ЗША, Японіі, Кітаю, Гавайскіх выспаў.

Пераважная большасьць гэтых ліцьвінаў-беларусаў мусіла эміграваць з палітычных прычынаў, бо Бацькаўшчына стала каленіяй Расейскай Імпэрыі. Іхныя здольнасьці зрэалізаваліся па-за межамі Беларусі, яны сталі абаронцамі Свабоды, Нацыянальнымі героямі іншых краін, праўдзейнымі сябрамі замежных акадэміяў. Багата нашых суайчыньнікаў “прыватызавалі” нашыя суседзі. Сёньня, маючы папяровую незалежнасьць, Беларусь працягвае траціць маладую і чынную частку грамадзтва. Ці ж не надакучыла беларусам быць “донарамі” далёкіх і блізкіх суседзяў?

***Алесь Крой***

**бюлетэнь «СВОЙ ЛАД»**
**выходзіць 1 раз у месяц**
**наклад 299 асобнікаў**
**для нутранога карыстаньня**
**распаўсюджваецца задарма**
**пры перадруку спасылка абавязковая**

**рэдактар - Віктар Сазонаў**
**стылёвае рэдагаваньне - Юры Пацюпа**
**шыхтоўля - Зьміцер Дулько**
**падрыхтаваны да друку: 11.06.2003**
**тэл. 44-24-97, e-mail: sazonau@tut.by**
**адрас для ліставаньня: 230023, Гародня, а\с 121**



№ 7 чэрвень 2003

# Свой Лад

інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

Гродзенскага аддзяленьня ГА «Фонд імя Льва Сапегі»

**у нумары:**

- пад знакам Льва
- сумежжа і замежжа
- грамадзтва
- актуаліі



# У чорных плямах гістарычнай памяці

*Старадаўная мудрасьць кажа, што народ, які забыўся сваю мінуласьць, асуджаны перажыць яе зноў. Ніхто ня хоча вяртацца ў цяжкую мінуўшчыну, каб зноўку зьведаць яго боль. Кожны хоча будаваць сьветлую будучыню для сябе і сваіх нашчадкаў, дасягнуць посьпеху, абысьці няўдачы на сваім жыцьцёвым шляху. А адным з найлепшых дапаможнікаў ухіленьня ад катастрофы ёсьць гістарычная памяць.*



Ніхто з нас не хацеў бы больш зьведаць страшэнных жудасьцяў тае вайны, сумная гадавіна ад пачатку якой прыпадае на чэрвень. Кожны чацьвёрты беларус не дажыў да яе заканчэньня. Якая жахлівая лічба! А чаму так сталася? Чаму народ, які сам не абвяшчаў нікому вайны, ні яму ніхто, і наагул не хацеў ваяваць, так моцна ўцерпеў? Вельмі важна знайсьці адказ на гэтае пытаньне, калі мы ня хочам перажыць таго жаху яшчэ раз.

Вайна, пачаткам якой у Беларусі лічыцца 22-га чэрвеня 1941-га году (напад Нямеччыны на Савецкі Саюз), у Гародню прыйшла ў 1939-м. Тады беларусы, якіх пабралі ў польскае войска, мусілі ваяваць на два франты: супраць гітлераўскіх войскаў на захадзе, а таксама супраць Чырвонай арміі на ўсходзе, у якой таксама было нямала беларусаў. Вось яно і выходзіць, што ўжо з 39-га году беларусы пачалі малаціць адзін аднаго. Ня дзіва, што мы ўвайшлі ў рэкардсмэны паводле колькасьці ахвяраў. Дарэчы, гэта было не ўпершыню. Таўклі беларусы самыя сябе і ў напалеонаўскай вайне. Не давалі спуску сваім земляком у грамадзянскай, і ўусіх іншых войнах, паўстаньнях, бойках, якія чыніліся пасьля страты беларусамі незалежнасьці і свае дзяржавы. Страціўшы свабоду, мы сталі забіваць самыя сябе.

Ваявалі беларусы і ў Чырвонай арміі, і ў Войску польскім, і ў Арміі краёвай, і ў чырвоных партызанах, і за Нямеччыну і за Сталіна. А называлі адзін аднога - ворагамі і здраднікамі. Хоць часьцяком былі сваякамі, расьлі ў адной вёсцы. Страціўшы сваю вольную Бацькаўшчыну, называлі радзімаю мноства чужынаў, ад савецкае дзяржавы - да ніколі не існавалых прыдумкаў. Вось і ня ведаем, каго перш-наперш вінаваціць ва ўсіх нашых бедах. Ці чужакоў якіх, каторым да нас не было і нябудзе аніякае справы, ці сябе самых.

Большасьць з тых, што ня ведалі за якую ўладу ваяваць, былі звычайнымі, добрымі, руплівымі і гаспадарлівымі людзьмі. Марылі пра дабрабыт і годнае жыцьцё сваіх дзяцей, не шкадуючы сілаў працавалі на іх будучыню. І ніхто ім не даведаў, хто такі Гітлер, ці хто такі Сталін. Толькі ўрад свае незалежнае дзяржавы мог гэта зрабіць. Але такога ўраду не было. Вось і выходзіць, што не быты незалежнасьці заўсёды павялічваюць колькасьць ахвяраў, дзе бі дзеля якой мэты гэтыя войны ні вяліся. І гінулі на гэтай вайне беларусы, аднев едамага Яські зь неведамага хутару, да знакамітага патрыёта і змагара за незалежнасьць Беларусі, генэрала Булак-Балаховіча, які загінуў бароначы Польшну ад гітлераўцаў. Не забыцца б нам гэтае навукі зараз, зрабіць бы адпаведныя высновы. Можа до" нам чорных плямаў у нашай гістарычнай памяці. Лепш іх асьвятляць успамінамі, чым заліваць уласнаю крывёю.

Ня ўсе людзі ў Беларусі нават цяпер лічаць такія высновы разумнымі. Па-ранейшаму ідуць гутаркі пра агульную грашовую прастору з Расеяй, пра патрэбу паглыбленьня інтэграцыі, пра адзіную дзяржаву. Зноў пра адзіную! Але гістарычная памяць нам падказвае, што не рубель, ці, як яго называюць у народзе, абрубак, можа даць дабрабыту нашай Бацькаўшчыне, а толькі ўласная валюта. Што не чужое войска можа абараніць наш народ, а толькі сваё. Што ніхто пра нас не парупіцца, калі мы самыя пра сябе не парупімся.

У траўні працягвалі клапаціцца за нас іншыя. Перш за ўсё здумалі, што нам ня трэба чытаць "Беларускай дзелавой газэты". Такое зьмеркаваньне прыпала якраз на той месяц, у якім сьвяткаваўся дзень свабоды друку, і міжнародны, і свой уласны. Заклапочанасьць пра нас ня мае нейкага там новага зьместу. Да закрыцьця газэт мы звыкліся, як да інтэграцыі з Расеяю. Часамі здаецца, што яны ідуць паралельна, чым больш інтэграцыі - тым больш закрываецца газэт. Дзіўныя нейкія супадкі. Ну, а калі інтэграцыя набывае вельмі хуткі тэмп - тады да закрыцьця далучаюцца і грамадзкія арганізацыі, як, прыкладам, травеньская спроба зьліквідаваньня "Ратушы".

Ці ў Гародні няма іншых праблем? Бо для пераважнае большасьці гарадзенцаў галоўнаю праблемаю траўня стала эпідэмія мэнінгіту. Пакуль мэдыкі шукаюць прычынаў эпідэміі, простыя грамадзяне далі ўжо сваю ацэну: горад пакараны за разбурэньне могілак. Нават дзікуны не абходзяцца з чалавечымі касьцьмі так, як гэта зрабілі "цывілізаваныя" людзі. Танцы на чалавечых касьцях - па-іншаму і не назавеш. Але чаго можна чакаць у горадзе, на цэнтральным пляцы якога стаіць помнік Леніну! Дзякуй Богу, яшчэ не дажылі да канібалізму. Але ўжо мала бракуе.

Тыя, хто шукае хваробы ў вадзе, ці ў струпянелых касьцях можа там яе і знойдзе, але гэта толькі вонкавы бок. Запраўдная хвароба, найстрашэньнейшая, жыве ў душах тых людзей, якія могуць абходзіцца з чалавечымі касьцямі, як з сабачымі. Акара ляжа на ўсіх. Ці тут і цяпер, ці там... пазьней. Бо, калі большасьць людзей кладуцца спаць ці едуць на адпачынак, ці займаюцца яшчэ чым - іншыя людзі, ад імя маўклівае згоды першых могуць чыніць няпраўду. Але адказнасьць кладзецца на ўсіх. І за разбурэньне габрэйскіх могілак у Гародні, і за зьдзек з памяці нявінна забітых людзей у Курапатах, дзе на чалавечых касьцях будуюцца катэджы. Да якіх жа межаў гэтае нелюдзтва можа дайсьці? Гэтая праблема ёсьць перш-наперш духовым заняпадам. І палягае яна на тых чорных плямах нашае гістарычнае ня памяці.

На паседжаньні "Гарадзенскае ініцыятывы" падтрамалі прапанову абзборы подпісаў ў абарону Курапатаў. Толькі тады, калі жывыя будуць бараніць сваіх памерлых і ўшаноўваць іх памяць - мы можам разьлічваць і на праўдзівае аднаўленьне гістарычнае памяці народу, што ня дасьць яму далей рабіць жудасных памылак, і страчваць за адну вайну кожнага чацьвёртага суайчыньніка.

У гэтым месяцы, гарадзенцы, якія шануюць свае традыцыі - рыхтуюцца да сьвяткаваньня аднога з найдаўнейшых беларускіх сьвятаў, Купальля. Іншыя ж, зноў кінуліся на выбары. На гэты раз нават не ўзьнікае думкі, каб паставіць у ладзе нейкія ўмовы, альбо абмеркаваць мажлівасьці няўдзелу ў выбарах. Здаецца, зусім нядаўна былі мінулыя. Але высноваў зь іх ніхто не зрабіў. Нават болш-менш талковага аналізу. Чарговая чорная пляма. Колькі ж можна ўжо іх перакрочваць? Можа прыйшоў час зьвярнуцца ў малітвах па раду да нашай нябёснай апякункі Ефрасіні Полацкай, дзень памяці якой беларусы адзначаюць у гэтым месяцы.

**Віктар Сазонаў**

# Аляксандар Антанюк: закон трэба выконваць, але закон мусіць быць разумным

*Аляксандар Антанюк добра ведамы на Гарадзеншчыне як грамадзкі праваабаронца, апошнія гады воляй свайго пакліканьня ў эпіцэнтры ўсіх найважнейшых грамадзка-палітычных падзей, браў удзел у розных кшталту выбарных кампаніях, стала выступае як абаронца ў шматлікіх надуманых “палітычных” справах, калі ўлада насамрэч парушае элемэнтарныя канстытуцыйныя правы грамадзянаў. З ім надзённая гутарка рэдактара “СЛ”.*

***- Шырокаму колу, на жаль, мала ведама, што такое Хельсынскі Камітэт, якая гісторыя закладаньня вашай арганізацыі?***

- Цікава, што людзі часам зьвяртаюцца да нас з пытаньнямі кшталту: перакласьці на фінскую мову тыя ці іншыя заявы. Адразу хачу патлумачыць пра існасьць рэчаў. У 1986 годзе Юрый Арлоў - прафэсар, фізык, якраз у той час, калі была падпісаная хельсынская дамова паміж Савецкім Саюзам і ЗША, у хельсынскім пагадненьні зьвярнуў увагу на адзін абзац. З ягосьведчыла, што краіна, якая ўсклала на сябе абавязкі, мусіць выконваць тыя самыя хельсынскія пагадненьні. Тады ж ён заснаваў Маскоўскую Хельсынскую Групу. Выкрываў існую сыстэму савецкага грамадзтва, праводзіў адкрытыя прэсавыя канфэрэнцыі, на якіх журналісты запрашаліся дахаты. Такім спосабам сярод татальнага маўчаньня ішоў голас праўды. У гэтую Групу ўходзілі вельмі ведамыя людзі – навукоўцы, інтэлігенцыя. На той час гэта быў запраўдны грамадзянскі ўчынак, бо Савецкі Саюз - маштабная дзяржава ў ціску. А значана група праіснавала нядоўга і практычна была зьнішчаная. Прафэсар Арлоў атрымаў 5 гадоў турмы, іншыя таксама нейкі час правялі ў псыхшпіталях, месцах пазбыцьця волі. Тым няменш яны абудзілі грамадзкасьць.

Сёньня Хельсынскі рух налічвае 39 краін-удзельніц. Яны аб’яднаныя ў Міжнародную Хельсынскую Фэдэрацыю. Штаб-кватэра - у Вене.

Беларускі Хельсынскі камітэт быў створаны ў 1995 годзе. Яго заснавалі беларуская эліта, інтэлігенцыя.

***- Што складае аснову дзейнасьці БХК?***

Беларускі Хельсынскі Рух – грамадзкая, непалітычная арганізацыя, якая назірае за міжнароднымі забавязаньнямі той ці іншай краіны (у даны момант гаворыцца пра Беларусь). На жаль, падпісваючы тую ці іншую міжнародную канвэнцыю правоў чалавека, краіна бярэ на сябе шэраг добраахвотных абавязкаў. У Беларусі, на жаль, насамрэч справа стаіць так, што падпісаньне канвэнцыі патрэбнае кіроўным палітыкам дзеля таго каб *расшаркваццаў* міжнародных салёнах. Паказаць, якія яны дэмакраты, як усё добра робяць. Насправе ж тыя канвэнцыі не выконваюцца, пра што сьведчыць доўгі шэраг прыкладаў. Тады Хельсынскі Камітэт, праводзячы маніторынг, зьвяртаецца ў міжнародныя арганізацыі, АБСЕ. І даводзіць усюды праістотныя парушэньні.

***- Як паўстала Гарадзенскае абласное аддзяленьне Беларускага Хельсынскага Камітэту і якія ягоя мэты?***

- Ёсьць Рэспубліканскае грамадзкае аб’яднаньне БХК, мы ягоструктурны падразьдзел. У Гарадзенскім абласным аддзяленьні насёньня ёсьць два прадстаўніцтвы - Ваўкавыскае і Лідзкае. У гэтых прадстаўніцтвах створаныя грамадзкія прыёмні, дзе кваліфікаваныя юрысты дапамагаюць людзям. Ведама, мы няможам здаволіць патрэбы ўсіх людзей, што зьвяртаюцца. Найперш зьвяртаем увагу на тыя справы, якія датычаць міжнародных забавязаньняў. Важна вызваць рэзанансу грамадзтве. Нават усёньняшніх умовах можна і трэба бараніцца. Ёсьць мэханізмы абароны асноўных правоў і свабод чалавека. Мы спрабуем зьмяніцьстан заканадаўства. Наколькі можна скарыстоўваем ААНаўскую сыстэму абароны правоў чалавека.



Звароты да нас грамадзян рознага кшталту, яны датычаць сямейнага, працоўнага, крымінальнага права. Даводзіцца рабіць сэлекцыю. Часам стае адной кансультацыі. Калі пытаньне мае грамадзкую вартасьць, змагаемся аж но да суду. Там, дзе бачым, што ўлада надужывае сваімі паўнамоцтвамі - стараемся прыйсьці людзям на дапамогу БХК цікавіць менавіта аспэкт дачыненьняў чалавека і ўлады.

***- Характарыстыка апошніх выбараў у мясцовыя саветы і наагул выбараў у Беларусі.***

- За апошнія пяць гадоў я браў удзел у розных выбарчых кампаніях, ў апошнюю як беспасярэдні ўдзельнік працэсу. Усе выбары адбываюцца па водле схемы. Сёньняшняе выбарчае заканадаўства настолькі недасканалае, што дае ўладам змогу маніпуляваньня. Выбарчы працэс у Беларусі не адпавядае міжнародным стандартам, дакумэнтам Капэнгагенскага пагадненьня. Ён недэмакратычны і неадкрыты. Не ўлучаецца аніводнага прадстаўніка ад грамадзкіх арганізацыяў, палітычных партыяў у склад выбарчых камісіяў – гэта першая прычына. Другая прычына: за выбарамі нельга назіраць, бо назіральнікі фактычна ізаляваныя ад выбарчых камісіяў. Гэтыя падставы дазваляюць меркаваць, што вынікі галасаваньня падтасоўваюцца. Калі не даюць сустрэцца з выбарцамі, калі не пускаюць у студэнцкія інтарнаты, калі не даюць сустрэцца з настаўнікамі – гэта сьведчыць пра тое, што ўлада ня хоча зьменаў. І ў далейшым сытуацыя будзе горшыцца. Пра тое сьведчаць і закрыцьцё газэты “Пагоня”, затрыманьне на тры месяцы выпуску “Белорусской деловой газеты”, ціск на “Ратушу” і г. д. Ідзе “зачыстка” інфармацыйнага поля.

***- Ці можна гаварыць аб прадказальнасьці, тэндэнцыі судовых спраў людзей, затрыманых на вулічных акцыях?***

- Ёсьць пакт аб грамадзянскіх і палітычных правох. Гэты пакт падпісаны і ратыфікаваны Беларусьсю. Гэта і ёсьць міжнароднае забавязаньне. Існуе шэраг настаноў у Канстытуцыі, якія абмяжоўваюць удзел у мітынгах, вулічных шэсьцях, сходах. Згодна з канстытуцыяй РБ (арт. 23) абмежаваньне правоў і свабод асобы дапушчаецца толькі ў выпадках, якія закранаюць інтарэсы нацыянальнай бясьпекі, грамадзянскага парадку, абароны маральнасьці, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб. На жаль, існы закон аб сходах, мітынгах і вулічных шэсьцях нясе сама істотнае абмежаваньне, ён мае дазваляльны характар, пра што ня сказана ў канстытуцыі. Калі выходзіць зь лёгікі, то ўвесь пералік абмежаваньняў адлюстраваны ў канстытуцыі, і закон не павінен ісьці далей.

Добра ведама, як разглядаюцца заяўкі на праводжаньне публічных акцыяў, грамадзкіх мерапрыемстваў у нашых выканкамах. Адсюль усё і вынікае.

Суддзі, у сваёй бальшыні, выдатныя юрысты. У іх пазытывісцкае мысьленьне: “ёсьць закон, значыць, я павінен яго выканаць, ёсьць “дазваляльны” характар – значыць закон парушаны”. Я заўжды падаю прыклад: законы існавалі і ў нацыскай Нямеччыне, выконваліся яны дасканала, акуратна, зь нямецкаю пэдантычнасьцю. Закон трэба выконваць, але закон таксама павінен быць разумны. Мы адаслалі некалькі скаргаў у Камітэт Правоў Чалавека. Спадзяемся, ён зробіць належныя рэкамэндацыі да ўраду Беларусі на зьмены заканадаўства.

Апошняя рэзалюцыя па Беларусі, прынятая камітэтам правоў чалавека ААН вельмі сур’ёзная і жорсткая. Далейшае разьвіцьцё дзяржавы і грамадзтва залежыць ад таго, як урад Беларусі прыслухаецца да рэзалюцыі, як далей ён будзе падганяць сваё заканадаўства пад міжнародны стандарт, як ён будзе выконваць прынятыя на сябе міжнародныя забавязаньні.

***Распытваў Віктар Сазонаў***

# Праца: кара ці мара?

**Праца для чалавека – гэта спосаб існаваньня, дзяльніца шуканьня сэнсу, крыніца думаньня, урэшце, спосаб карысна скарыстаць час.**

А што значыць праца для беларускага чалавека? Як ведама, беларус славіцца сваёю працавітасьцю. Для ўсіх нас яна крыніца існаваньня, хоць і несамавітая. Праца надае беларусу пачуцьця ці ня поўнай апраўданасьці за сваё жыцьцёвыя слабасьці. Ужо не адно стагодзьдзе ён цяжка працуе не пакладаючы рук, а жыцьцё яго ўсё роўна застаецца бедным, убогім, незарганізаваным, калі-дык нават брудным.

Калі выходзіць зь Бібліі, то цяжкою працаю на кожны дзень чалавек быў не ўзнагароджаны, а пакараны за грахі свае. З гэтай пары праца набывала свой ства ральны сэнс толькі тады, калі дзейнасьць чалавека скіроўвалася на набліжэньне, крок за крокам, да таго "раю", зь якога аднойчы ён быў выгнаны. Ці наблізіўся беларус за ўсе стагодзьдзі, дзесяцігодзьдзі, астатнія гады да свайго раю так, каб можна было сёньня казаць аб слушнасьці выбранага шляху? Пытаньне рытарычнае. А раз набліжэньня да раю не відаць, то ці маем мы права шчыра ганарыцца сваёю працавітасьцю? Сытуацыя была б парадаксальная, калі б не рознабаковасьць сьвету. Не гармануе фізычная працавітасьць беларуса зь яго жыцьцёвою лянотай: нежаданьнем зразумець іншага, лянотаю аналізаваць праблемы, урэшце, павярнуцца да самога сябе, зьмяніцца, удасканаліцца.

Што дае праца ў правінцыйных мястэчках: Бераставіца, Сьвіслач, Іўе?.. Прыкладна 0.3– 0.4% працуюць у дзяржаўным сэктары (ён у нас паку льшто пануюе), атрымоўваюць заробак за 400 тыс. рублёў. Звычайна гэта людзі, якія не займаюцца стварэньнем вартасьцяў, але маюць дачыненьне да арганізацыйнага забесьпячэньня дзейнасьці палітычнага рэжыму і разьмеркаваньня вартасьцяў. Гэта ім мы абавязаныя сваімі цяжкасьцямі і ўбогасьцю. Многія зь іх, забыўшыся на сваё сялянскае мінулае, уяўляюць сябе "вылучнымі" сярод "астатняга сьмецьця".

Наступныя 2-2,5% грамадзян, з заробкамі за 160 тыс. рублёў – гэта сфэра адміністрацыйнага абслугоўваньня вышэйазначанае групоўкі грамадзян. Часткова сюды ўходзяць і тыя, хто займаецца працаю ў розных арганізацыях. Сюды ж улучаюцца і найадукаванейшыя, як для нашае правінцыі, людзі ўсіх роўняў.

Рэшта, каля 97 % працоўных грамадзян, заробак якіх ніжэйшы за 160 тыс. рублёў, можна назваць ахвярамі палітычнае сыстэмы, ахвярамі свайго выбару, - выбару прэзыдэнта, дэпутатаў усіх роўняў, ахвярамі страху, што адбяруць нават тыя капейкі, якія "плаціць" "ён". Жалю вартыя ўзнагароды за васьмігадзіннае шаленства на працы, мізэрныя пэнсіі на сталыя гады. На ўтрыманьне жытла, пры эканоміі на адзеньні і добрым харчаваньні, ім даводзіцца выдзяляць увесь месячны заробак. Жывем паводле Маркса, што чалавеку патрэбна перш за ўсё. А больш можна не даваць.

Але пакінем цяжкія ўражаньні ад эканомікі "рынкавага сацыялізму", у тэарэтычных лябірынтах якога нік не карысьць ад нашай працавітасьці, і пяройдзем да беспрацоўя. На паперах стан зь беспрацоўем выглядае нязгоршым. Тэарэтычна - ёсьць нават змога забясьпечыць працай усіх. Але на самрэч тое, што прапануецца, нагадвае забесьпячэньне працаю ўцекачоў зь бяднейшых краін. Палі і фэрмы калгасаў чакаюць вас, будаўнікі "рынкавага сацыялізму"! А ці варта працаваць на месцах, функцыянаваньне якіх мае больш палітычнае, чым эканамічнае значаньне? Ці адпавядаюць умовы працы на сёньняшняй вёсцы, ровеньу знагароды за працу сучасным цывілізаваным патрабаваньням - пытаньне рытарычнае. Можа нам супакоіцца і падобную працавітасьць усприймаць як лёзунг "Пераадолеем часовыя цяжкасьці!"?



Аднак пры будаваньні міні-СССР ў адной асобна ўзятай невялікай дзяржаве цяжкасьці, характэрныя для неарганізаванага грамадзтва - зьява бясконцая. Сацыялістычная схема забесьпячэньня людзей працаю - разбуральная для грамадзтва. Камандна-адміністрацыйная сыстэма ніколі ня мае грошай на стварэньне прыстойных месцаў працы, дзе чалавек мог бы спакойна і дарэчна ахвяраваць восем гадзін свайго жыцьця ў дзень. Нават сама ўбогі чалавек, сьведама пагаджаючыся на падман, прагне ў душы справядлівасьці. Але дарма, замкнёная ў сабе ўлада ніколі не пасьпявае за агульначалавечым разьвіцьцём.

Наша ўлада па-рознаму стымулюе беспрацоўе. Прыкладам, калі грамадзянін шмат траціць энэргіі на палітычнае жыцьцё ня ўзгодненае з "генэральнаю лініяй", то ён проста выкідваецца з рынку працы і ня мае права на жадную канкурэнцыю. Ведама, трэба ж застрашыць іншых, спаралізаваць палітычную сьведамасьць чалавека. "Мы ня пойдзем за цывілізаваным сьветам!" І ня ідзем. Выкінутай з рынку працы можа адчуць сябе асоба, якая на ўласнае жаданьне, звольнілася з калгасу. Асабліва адчулі гэта грамадзяне, што звольніліся з калгасаў Бераставіцкага раёну. Улада ламае лёсы людзей не зважаючы на сумленьне і правы.

Гледзячы на нашую палітычную сыстэму нельга не зьдзіўляцца. Пасьля апошніх выбараў у мясцовыя Саветы зьявілася найноўшая форма беспрацоўя – беспрацоўны дэпутат. Аўтар гэтага артыкулу ўжо дзесяць гадоў у палітыцы альтэрнатыўнай ураду. Дзесяць гадоў клопатаў з працаю. Дзесяць гадоў гульняў у "чалавечнасьць" з высокіх трыбун. І зусім па-чалавечаму нікога не цікавіць, чым жыве мая сям'я. Добра, калі я такі "антыграмадзкі", дык чаму ж астатнія жывуць у жабрацтве, і з працаю і бяз працы? Выходзіць мы і мары, пра лепшае жыцьцё, тых, хто мяне абраў, гноем павінны легчы дзеля таго, каб нехта спакойна і смачна мог жэрці. Ну а ты, прыстойны беларус, дзе ты? Ты ж грамадзянін Рэспублікі Беларусь, у якой ёсьць створаны тваёю працаю і падаткамі бюджэт. Як ты мог дазволіць, каб нехта распараджаўся грашыма твае дзяржавы, нават табою? Не сядзяць пры ўладзе справядлівыя, калі ўнізе, у турмах, сядзяць журналісты!

*Уся наша сыстэма - ня што іншае, як палітыка недаверу да чалавека, нежыцьцяздольны гібрыд сацыялізму пад маскаю рынкавай эканомікі. Усё гэта моцна нагадвае Сярэднявечча. Не дапамаглі нашым людзям звычайная працавітасьць адных пры бясконцай прагавітасьці іншых. І ня трэба сёньня паўтараць старых абмылаў, бо неўзабаве ўжо можам страціць Беларусь.*

***Алег Рамашкевіч,***
***дэпутат раённага Савету,***
***Бераставіца***

# Доўгі рубель, але танны



За апошні месяц, кошт 1 даляру ЗША ў беларускіх рублёх узрос на 1,03%, а эўра – на 7,51%. Даныя лічбы сьведчаць аб імклівым зьняцэньваньні нацыянальнае грашовай адзінкі Беларусі. Аднак можа гэта тэндэнцыя толькі апошняга месяцу? Паглядзім на "паводзіны" беларускага рубля пачынаючы зь 1 студзеня 2003 г. па 8 чэрвеня 2003 г. (час аналізу). Курс даляру ЗША ўзрос ад 1920 беларускіх рублёў да 2047, курс эўра ад 1993 беларускіх рублёў да 2423, што адпаведна зьняцэніла кошт нацыянальнай грашовай адзінкі Беларусі што да даляру ЗША на 6,61%, да эўра на 21,58%. І ўсё гэта толькі за пяць месяцаў і адзін тыдзень...

Параўнаем паказьнікі нашых суседзяў за той самы пэрыяд:

- латвійскі лат ўзрос да даляру больш чым на 10% і нязначна панізіўся да эўра;
- літоўскі літ страціў свае пазыцыі да "адзінай" эўрапейскае валюты і ўзмацніўся да даляру ЗША больш чым на 15%;
- польскі злоты ўзмацніўся на 7% да даляру і зьняцэніўся на 8,5% да эўра;
- расейскі рубель узмацніў свае пазыцыі да даляру ЗША больш чым на 3% і паслабіў на 12,8% да эўра;
- украінская грыўна на дзясятыя долі працэнту ад даляру ЗША ўзмацнілася і больш чым на 14% зьняцэнілася да эўра.

Такім парадкам, з памянёных "суседаўскіх" нацыянальных грашовых адзінак і беларускага рублю, наша валюта – адзіная, якая страціла свае пазыцыі да даляру ЗША і нагул- рэкардсмэнка ў зьняцэньваньні што да эўра.

Згодна з гэтым, паўстае пытаньне: "Ці выгадныя, прапагандаваныя сябрамі праўленьня Нацыянальнага банку Беларусі і сябрамі Ўраду – Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, уклады ў беларускіх рублёх ці прывабнейшыя і прыбытковейшыя спосабы захоўваньня сваіх ашчаджэньняў у банкаўскіх установах краіны?"

Але 8 чэрвеня 2003 г. сярэдні працэнт укладаў у беларускіх рублёх па банках гораду Гародні, які ў цэлым па краіне, складаў 34% гадавых. Калі разгледзець даны паказьнік ад пачатку бягучага году, то ён у сярэднім складае 37,5%, што прыблізна 3% ў месяц. Шмат гэта, ці не?

Пэўна ж, з улікам рэальнай інфляцыі – вельмі мала. З гледзішча розных банкаўскіх укладаў. Паглядзім на табліцу.

Прымяркуем, што на 1 студзеня 2003 г. вы мелі 2 000 000 беларускіх рублёў, гэта было эквівалентна 1042$ ЗША ці 1004€.

Пры ўкладзе ў беларускіх рублёх вы б павялічылі сваю грошовую маёмасьць на 96$ ЗША, аднак паменьшылі б на 42€; пры ўкладзе ў далярах ЗША - павялічылі б на 32$ і паменьшылі б на 97€ (!); пры прыўкладзе ў эўра за 5 месяцаў і тыдзень Вашыя 1004€ ператварыліся б у 1035€ (+ 31) ці 1225$ ЗША (+183) ці 2 508 000 бел. рубл. (+508 000). Такім парадкам, на пастаўленае вышэй пытаньне можна адказаць наступным спосабам: найвыгаднейшы валютны ўклад ў эўра, а ня ўкладу беларускіх рублёх, прапагандаваны шматлікімі дзяржаўнымі дзеячамі Беларусі. Больш таго, з улікам паступовага паніжэньня Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь стаўкі рэфінансаваньня памяншаецца працэнт ў укладах у беларускіх рублёх, што робіць дадзены від укладу менш прывабным.

| Дата / Від укладу | 1 студзеня 2003 | 8 чэрвеня 2003 | | |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| | роўная сума ўкладу | Без уліку працэнт на працэнт | | |
| | | у бел. рублёх | у далярах ЗША | ў эўра |
| У бел. рублёх пад 37,5% гадавых | 2 000 000 | 2 330 000 | 1138 | 962 |
| У далярах ЗША пад 7% гадавых | 1042 | 2 198 000 | 1074 | 907 |
| У эўра пад 7% гадавых | 1004 | 2 508 000 | 1225 | 1035 |

Здаецца, што з студзеня 2004-га году, з магчымым аднначасным уводам на тэрыторыі Беларусі расейскага рубля, адтлыў укладаў у беларускіх рублёх будзе вокамгненным.

На чацьвёртым паседжаньні беларуска-расейскай сумеснай працоўнай групы распрацоўваньня прапаноў аб утварэньні адзінага эмісійнага цэнтру Саюзнай дзяржавы, што міну ў 7-га чэрвеня ў Менску, канчатковае зьмеркаваньне аб уводзе ў карыстаньне расейскага рубля ў якасьці адзінага плацельнага сродку на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ці аднначасным хаджэньні беларускага і расейскага рубля з 2004-га ці 2005 году не прынялі.

Нагадаем, што згодна з пунктам 3.2 праграмы дзеяньняў Рэспублікі Беларусь і Расейскай Фэдэрацыі ў рэалізацыі настаноў Дамовы аб стварэньні саюзнай дзяржавы ў 2005 годзе павінна адбыцца ўвядзеньне адзінай грашовай адзінкі. (У зьвязку з пунктам 3.1 Праграмы, грашовая эмісія будзе ўжыцяўляцца адзіным эмісійным цэнтрам. Але ж не выкананы яшчэ пункт па ўніфікацыі падаткоў а газаканадаўства?!)

Большасьць саюзных эканамістаў лічаць дапушчальным уводжаньне з 2004-га году адначаснага хаджэньня расейскага і беларускага рубля на тэрыторыі Беларусі з разлікам 1 да 70, а зь 1-га студзеня 2005-га году – толькі адзіная грашовая адзінка – расейскі рубель.

У цяперашні час адзін расейскі рубель ацэньваецца ў 67 рублёў. Так што, калі памянёныя прагнозы апраўдаюцца, тады беларускі рубель да канца году зьняцэніцца да расейскага яшчэ на 4,5 працэнты. "Пасьля чаго беларускі "заяц" назаўсёды ўцячэ ў расейскія лясы."

Пакуль жа беларускаму рублю запраграмавана законам "Аб бюджэце РБ на 2003-і год" зьняцэньвацца да даляру ЗША на 1,4- 1,5% ў месяц.

Агульнаэўрапейскія тэндэнцыі Беларусі не датычаць.

Такім вельмі сяброўскім дачыненьням нацыянальных грашовых адзінак Беларусі і ЗША пажадана было б перанесьціся на іншыя сфэры грамадзкага жыцьця двух народаў.

Можа прывязваньне беларускага рубля да эўра было б выгаднейшым, але для гэтага патрэбен доўгачасовы аналіз.

Сачыцьмем за сытуацыяй!

***Сяргей Міронаў***

# Кансэрватызм – характэрная рыса Беларуса

*У верасьні 1999 году ў беларускім палітычным раскладзе зьявілася Кансэрватыўна-Хрысьціянская партыя-БНФ пад кіраўніцтвам Зянона Пазьняка. Намесьнікам старшыні быў абраны Юры Беленькі. Міністэрства юстыцыі ў устаноўленым парадку зарэгістравала ўтворанае грамадзкае аб'яднаньне. Аднак да гэтуль многія грамадзяне недаўменна паціскаюць плячыма: а што ж такое наагул кансэрватызм і наколькі ён уласьцівы беларусу?*

### Пра што гаворка?

Слоўнікі тлумачаць сэнс слова "кансэрватар" як захоўваньне нечага ад марнаваньня, зьмены ці разбурэньня. Кансэрватары заўсёды аддаюць перавагу жорсткай структуры ўлады, лічаць, што чалавек слабы, часьцяком губляецца ў вірлівым жыцьці. Асобу павінны накіроўваць дзяржава, царква, сям'я і г.д. А яны могуць аслабнуць з розных прычын, таму патрабуюць сталага ўмацоўваньня. Кансэрватары ня супраць зьменаў, але без рэвалюцыйных нечаканасьцяў, праз паступовыя крокі, да якіх людзі ідэалягічна падрыхтаваныя загадзя.

Кансэрватары моцна трымаюцца за дзяржаўныя сымбалі дзеля падтрыманьня сваёй улады, бо мяркуюць, што дзяржава павінна абапірацца таксама на эмоцыі. Да свабоднай канкурэнцыі ставяцца з разуменьнем як да спосабу разьвіцьця ўласнага патэнцыялу, уласьцівага кожнаму грамадзяніну. Аднак дадаюць сюды натуральны лад канкрэтнага грамадзтва дзеля абгрунтаваньня свабоднага рынку. Лічаць, што прырода распарадзілася так, што заўсёды паўстае мацнейшая і шчасьлівейшая асоба. Да гэтага трэба ставіцца як да прыроднае зьявы. Тут ня можа быць гаворкі аб пераразьмеркаваньні здабыткаў і роўнасьці ў багацьці ці жабрацтве. Кансэрватызм схіляецца да аўтарытарызму ў рамах Законаў, паводзячы сябе высокімі думкамі аб захаваньні стабільнасьці грамадзтва, супраць лібэральнага індывідуалізму.

Эўрапейскія партыі, якія прапаведуюць кансэрватыўныя каштоўнасьці, маюць розныя назовы. Традыцыйна Кансэрватыўнай завецца партыя Вялікабрытаніі. У Германіі кансэрватары аб'яднаныя ў партыі "Хрысьціянскія дэмакраты". Ў Аўстрыі гэта - Народная партыя, у Швэцыі – партыя Памяркоўны Зьвяз, у Грэцыі – Новая Дэмакратыя, у Гішпаніі – Народны Альянс…

У былым савецкім грамадзтве і цяпер на постсавецкай прасторы само слова "кансэрватызм" выклікала нэгатыўнае стаўленьне як да нечага застарэлага, што адцягвае "перадавы" рабочы кляс, і спрыяльнае да яго калгаснае сялянства, ад будаваньня сама "перадавога" грамадзтва ў сьвеце.

Тым часам ідэі кансэрватызму абгрунтоўвалі ў розныя часы такія ведамыя палітыкі, як ангельцы Эдмунд Бэрклі і Бэнджамін Дызраэлі, французы Жазэф дэ Мэстра, Люі Банальд, Франсуа дэ Шатабрыян, Фэліста дэ Лямэнэ, Жозэф Арцюр дэ Габіна, гішпанец Данас Картэс, немцы Ота фон Бісмарк, Карл Шміт, Марцін Гайдэгер, італіец Гаэтана Моска, амэрыканцы Дэніэл Бэла і Сеймура Марцін Ліпсэт. Сярод новых кансэрватараў вылучаюцца былыя прэзыдэнты ЗША Рональд Рэйган і Джордж Буш-старэйшы, яго сын, цяперашні прэзыдэнт Злучаных Штатаў Дж. Буш, былая прэм'ер-міністарка Ангельшчыны "жалезная лэдзі" Маргарэт Тэтчар, былы канцлер Нямеччыны Гельмут Коль. Ідэалёгія кансэрватызму пераважае ў палітыцы партыяў многіх краін Заходняй Эўропы і Амэрыкі, Японіі.

Цяпер да гэтых установак імкнецца далучыцца Кансэрватыўна-Хрысьціянская партыя-БНФ.

### Ці ўласьцівы кансэрватызм беларусу?

Чалавек дэмакратычных поглядаў адкажа на пытаньне станоўча і прыточыць шэраг прыкладаў, датычных, скажам, падзей апошняга дзесяцігоддзя. Наш зямляк у параўнаньні з суседзямі найменш успрымае каштоўнасьці рынкавай эканомікі: падазрона ставіцца да прыватнай уласнасьці, ня хоча прыватызаваць прадпрыемствы, не жадае самастойна гаспадарыць на зямлі, пільнуецца ідэяў славянска-праваслаўнае цывілізацыі.

У палітычнай сфэры беларусы таксама выявіліся большчым нетаропкімі.

Тут можна вылучыць два тлумачэньні гэтай зьявы. Першае, да раптоўных кардынальных зьменаў не была гатовая эліта грамадзтва. Гэтыя людзі ў сваёй бальшыні перабраліся зь вёскі ў горад, захавалі звыклыя нормы жыцьця, а маль што фэўдальна-патрыярхальныя каштоўнасьці, варожае стаўленьне да гэтак званых камэрсантаў з іх "нетрудовыми" даходамі – дробных землеўласьнікаў, саматужнікаў і г.д. Адмысловае стаўленьне новаспечанай эліты да законнасьці і ўласнасьці, асабліва калгаснай, пры абсалютным няведаньні правоў і асноўных свабодаў чалавека. Пры такім узоры кіраваньня аўтарытарныя мэтады ўжо зь дзяцінства ўвайшлі ў кроў. У вёсцы цар, Бог і герой – старшыня калгасу, у раёне – партыйны сакратар, цяпер – службоўцы выканкаму. Кожнаму, хто вышэй за цябе на сацыяльнай лесьвіцы, трэба да зямлі кланяцца.

Другое, Беларусь ня мела і не магла мець свайго Бразаўскаса, Валэнсы, Ландсбэргіса, нават Ельцына ці Краўчука. У нас былі кіраўнікі як найхарактэрнейшыя прыклады талерантнага беларуса, настолькі кансэрватыўна-ўстойлівага і разважлівага, што сваімі неадэкватнымі дзеяньнямі прынесьлі вялікую шкоду краіне. Іх непрацяглае кіраваньне стала трамплінам для разгону іншай асобы, чые погляды цалком аўтарытарныя, Аляксандра Лукашэнкі.

Сваю ролю адыграла і праваслаўная царква. Перабудова легалізавала рэлігію, якой раней чыніла перасьлед дзяржава і называла "опиумом для народа". Праваслаўе заўсёды бараніла роўнасьць людзей перад Богам, сваёй навукаю пераконваючы, што збавяцца альбо ўсе, альбо ніхто. Тут трэба шукаць карані калектывізму, вельмі ўласьцівага славянскаму этнасу. Збаўленьне адзінкі, а гэта значыць - уласнае змаганьне за дабрабыт, свабоду шчасьце ад пачатку падначалена агульнаму, і ня мае надзеяў на посьпех. Альбо ўсе, альбо ніхто. Роўнасьць убеднасьці ня так крыўдная для асобы, бо навокал "усе так жывуць".

З іншага боку беларускі кансэрватызм не такі ўжо і кепскі. Асабліва гэта бачыцца, калі зазірнуць углыб гісторыі народу. Менавіта прыхільнасьць беларуса да захаваньня сябе як народу дазволіла яму выжыць, не зважаючы на сама неспрыяльныя ўмовы існаваньня. Беларусы свае людзкія страты лічылі мільёнамі. На нашай тэрыторыі заўсёды скрыжоўвалі мячы далёкія і блізкія суседзі. Трава мае ўласьцівасьць слацца ў час непагоды, а пасьля зноў выпроствацца. Паўстаць збройна супраць мацнейшых і лічнейшых прыхадняў, значыць, быць цалком зьнішчанымі. Гэта можна назваць прыстасавальнасьцю да ўмоў. Але можна ацаніць, як разважлівасьць і мудрасьць.

Найболь падкрэсьлівае станоўчы характар кансэрватызму беларуса яго стаўленьне да роднае мовы. Як ні забаранялі заваёўнікі, як ні нішчылі стагоддзямі – нічога не атрымалася. Галоўны носьбіт — сялянства, усё глыбей загаянялася ў вёску-рэзэрвацыю, але роднага слова ня выракался, уратавала яго для нашчадкаў, нібы та разумеючы, што ў справе абвяшчэньня будучай дзяржаўнасьці краю мова стане найважнейшым здабыткам нароўні з тэрыторыяй, гісторыяй, культурай, этнічнымі адрозьненьнямі. Нездарма беларус высока цэніць маральныя каштоўнасьці: сям'ю, сумленьне, духоўнасьць, веру ў Бога, цярплівасьць, дабрачыннасьць. На Гарадзеншчыне павага да гэтых якасьцяў вышэйшая, чым у цэлым па Беларусі.

### Што з гэтага вынікае?

Іншыя айчынныя палітолягі бачаць у празьмерным кансэрватызме беларускай супольнасьці небясьпеку для дэмакратычнай трансфармацыі грамадзтва. Выказваецца думка, што чапавыя слаі, здольныя ўжыцьця вызваць эканамічны прагрэс, ня здолеюць вырвацца з-пад моцнага ўплыву носьбітаў кансэрватыўнае ідэі.

Гэта ілюзія, бо цяперашні рэжым мае запас трываласьці, абапіраючыся на падтрым устойлівай большасьці электарату. Але і спадзевы на кансэрватыўныя эвалюцыйныя зьмены таксама ня маюць пад сабою падстаў, бо на нявызначаны час зацягваюць разьвязаньне надзённых праблем, умацоўваюць уладу зь яе антырынкавую накіраванасьцю.

Праўду трэба шукаць пасярэдзіне. Спроба сілавога разьвязаньня праблемы, а тэндэнцыі да гэтага адзначаюцца ў грамадзкай сведамасьці, толькі паглыбіць раскол нацыі. Грамадзянскія супроціны прынясуць толькі гора і разбурэньне. Спроба ўладаў пакінуць усё "як ёсьць" таксама цягне за сабою маклівы ўзрост незадаволенасьці мас а ўстварае вы бухоўную непрадказальную хаду падзей. Як кажуць шахматысты, патавая сытуацыя…

Без паправак на досыць глыбокі кансэрватызм беларускага грамадзтва не абысьціся ні дэмакратам, ні ўладным структурам. Кансэрватыўны пачатак нацыі патрабуе глыбокага зразуменьня. Гэтую гістарычную канечнасьць адчуў Зянон Пазьняк, ствараючы Кансэрватыўна-Хрысьціянскую партыю-БНФ. Ведама, маючы агульныя для заходнеэўрапейскага кансэрватызму рысы, беларусы маюць і выразныя адметнасьці.

**_Антон Лабовіч_**

# “Удзячым Богу за сьвятых…”

*Ёсьць у Беларусі мясьціны, пазначаныя Панам Богам – Будслаў і Пінск, Полацак і Наваградак, Нясьвіж і Гародня… Гэтыя мясьціны сталі сьведкамі нараджэньня, ахвярнага жыцьця ці пакутніцкае сьмерці сьвятых, альбо асьвечаныя цудамі і асаблівай духовай магутнасьцю, якія жывілі веру ў час цяжкіх выпрабаваньняў.*



Гарадзенскі касьцёл Найсьвяцейшай Панны Марыі – найстаражытнейшы каталіцкі храм гораду, які выконваў функцыі фарнага касьцёлу некалі квітнелае вольнае магдэбургскае Гародні. Уфундаваў гэты касьцёл Вялікі князь Вітаўт у канцы 14 стагоддзя, чаму касьцёл да сёньняшніх дзён і называюць Фарай Вітаўта. Першая Фара была пабудаваная з дрэва і ўражвала веліччу ды хараством, што адлюстроўвала гонар гараджанаў за свой горад у вачох заезджых гасьцей і прыхадняў, якіх багата зьбіраў брукаваны пляц Рынку ў час магдэбургскіх кірмашоў і гарадзкіх фэстаў на ўшанаваньне апекуна Гародні сьвятога Губэрта. Пэўна, ня зблякла тое хараство і праз 200 гадоў, калі ў 1584 годзе ўзрушаны выглядам касьцёлу езуіцкі правінцыял Кампана напісаў у лісьце, скіраваным у Рым, што гэта “найвялікшы і найхарашэйшы касьцёл у Вялікім княстве Літоўскім”.

Праз стагоддзі аблічча Вітаўтавай Фары данесла да нас гравюра Гародні, выразаная нюрнбэргскім майстрам Марцінам Цюндтам паводле арыгінальнага малюнку Ганса Адэльгаўзэра да выданьня “Атляс угарадоў Эўропы”, які пабачыў сьвет у 1568 годзе.

Старажытны Вітаўтаў храм у 15 стагоддзі асьвяціла найнысьцейшая малітва каралевіча Казімера, унука Ягайлы, сына караля Казімера Ягелончыка і Аліжбэты Габсбургскай, будучага сьвятога каталіцкага касьцёлу. За час свайго княжаньня ў Літве, Казімер Ягелончык жыў у Гарадзенскім замку, пабудаваным Вітаўтам. У 1445 годзе сюды, у Гародню, прыбыло да яго з Польшчы высокае пасольства на чале з гнезнаўскім арцыбіскупам Вінцэнтам Катом, які ў замкавай капліцы, ведамай сёньня як Верхняя царква, узьнёс над галавой Вялікага князя Казімера Ягелончыка польскую каралеўскую карону. Пазьней у родны Гарадзенскі замак кароль Казімер Ягелончык накіраваў свайго любага, але хваравітага сына, нашчадка польскае кароны, каралевіча Казімера, з надзеяю, што чыстае паветра Гародні папраівіць слабое здароўе юнага каралевіча.

Годны выхаванец славутага храніста ксяндза Яна Длугаша, каралевіч Казімер, вылучаўся добрым і чыстым сэрцам, апекаваўся ўбогімі, часьцяком да позьняе ночы маліўся перад дзьвярыма Фары Вітаўта. У Гарадзенскім вялікакняскім замку каралевіч Казімер памёр 4 сакавіка 1484 году. Але і сёньня адданыя гараджане калі-нікалі сярод стракатага натоўпу сярэднявечнага Рынку, на які глядзела старажытная Фара, заўважаюць лятуценны вобраз сьвятога юнака ў чырвонай мантыі, які агарняе сваёй апекаю найтрадыцыйнейшы горад Беларусі.

Кароль Стафан Баторы запрасіў у Гародню, дзе ён пражыў усе гады свайго валадарства на польскім троне, езуітаў, каб яны заняліся тут асьветаю. Ён жа перадаў езуітам плян Гарадзенскае Фары Вітаўта, каб тыя на месцы драўлянага ўзьнесьлі новы, мураваны касьцёл, дзе кароль выказаў волю пахаваць яго. У 1584 годзе двор, сьвятарства і гараджане былі пры ўрачыстым асьвячэньні кутнага каменю пад новы храм. Неўзабаве над Рынкам узьнёс сваю лебядзіную вежу-званіцу мураваны рэнэсансава-гатычны касьцёл, які дзівіў веліччу і хараством.

Унутры храму крыжовыя скляпеньні абапіраліся на крыжы іс сьцены, якія ўзмацнялі кантрафорсы, цэнтральны нэф праводзіў да галоўнага алтару ў больш нізкім прэсбітэрыі з трохкутнаю апсідаю, скіраванай у бок замку. На фасадах актыўны дэкаратыўна-малёўны эфэкт белага на чырвоным, які ствараўся спалучэньнем атынкаваных і пабеленых паверхняў званіцы, аркатуры і контрафорсаў з муроўкай чырвонае цэглы, што адпавядала старажытнай архітэктурнай традыцыі Беларусі. Чатырох’ярусная, з рэнэсансавым купалам званіца мураванага касьцёлу стала галоўнай архітэктурнаю дамінантай вольнага гораду Гародні, уздымаючыся над яго магдэбургскім цэнтрам – брукаваным Рынкам.

Праз 14 гадоў пасьля пабудовы мураванай Фары, у 1600 годзе, майстар-гравёр Тамаш Макоўскі, які працаваў у нясьвіскай друкарні князя Радзівіла, выразаў і адціснуў гравюру з выглядам Гародні, дзе красуе мураваны храм Найсьвяцейшае Панны Марыі, узьнесены на месцы драўлянай Фары Вітаўта.

Амаль два стагоддзі мураваная Фара заставалася галоўным каталіцкім храмам гораду, і ні войны, ні пажары не маглі пахіснуць высока ўзьнесеную над горадам званіцу. На касьцёльныя фэсты ў дзень сьв. Тройцы, на Божае Цела, на сьв. Міхала і Ўнебаўзяцьця Найсьвяцейшае Панны Марыі касьцёл і пляц Рынку запаўняў велізарны натоўп гараджанаў і гасьцей: працэсіі вернікаў, тэатральныя відовішчы, кірмашы. Пры касьцёле дзеілі брацтвы сьв. Тройцы і Анёлаў-Захавальнікаў. З сродкаў парафіянаў і фундуша каралевы Боны Фарны касьцёл утрымоўваў прытулак сьв. Духу, што стаяў на вуліцы Віленскай, непадалёк ад касьцёлу.

Але травеньскай ноччу 1782 году ад агню, што ўзьняўся ў габрэйскім доме, выгарала значная частка даўнага цэнтру Гародні. Згарэлі ўсе дамы па вуліцы Замкавай. Паводле падлікаў агонь вынішчыў у горадзе 300 дамоў і “касьцёл фарны мураваны, з усім, што ў ім было,” – як напісаў у лісьце да сваёй пані сакратар Ізабэлы Браніцкай з Гародні ў Беласток.

Пасьля гэтага пажару быў складзены цікавы дакумэнт, які патрапіў да мяне ў Віленскім архіве – “Акт візытацыі Гарадзенскага касьцёлу” 1783 году, што зафіксаваў практычна аварыйны стан парафіяльнага касьцёлу Гародні. Згодна з дакумэнтам, рамонту патрабавалі ня толькі муры, дах, слупы, але і “ў волава апраўленыя і з жалезнымі кратамі вокны”. На дзіва, як адзначыў візытатар, ксёндз Ежы Эйсмант, у касьцёле захаваліся ў добрым стане мураваныя хоры з разьбянаю драўлянай балюстрадай, разьбяная амбона з паліхромнымі скульптурамі чатырох эвангелістаў, сталярнай работы хрышчэльня з фігурай Яна Хрышнэньніка, аздобленыя багатай пластыкай алтары. Разьбяны галоўны алтар з Маці Божаю Чанстахоўскай быў апраўлены ў паліхромныя з пазалотай і серабрэньнем статуі Бога Айца і Сына, анёлаў і сьв. Станіслава. Гарадзенскія майстровыя цэхі разьбяроў, кавалёў, сталяроў мелі ў касьцёле свае прысьценкавыя алтары. Вылучаўся хараством алтар шавецкага цэху з абразамі сьв. Агаты і сьв. Казімера.

(заканчэньне на с.11)

# Помста памерлых

## альбо Канчатковы дыягназ

*Выбух хварэньня на сэрозны мэнінгіт страсянуў Гародню. Але прычына хваробы так і ня высьветленая па сёньняшні дзень. Тым часам гарадзкая пагалоска даўно ўжо дала свой адказ на пытаньне аб прычынах хваробы. Аказваецца - гэта зьвязана з рэканструкцыяй стадыёну "Нёман", дзе, нагадаем, раней былі габрэйскія могілкі. Нехта называе такую думку сьведамай дэзынфармацыяй, нехта бачыць у гэтым боскую кару.*


фота REX/Promedia

*пад вокнамі шпіталя*

### Танцы на касьцях

Сабакі расьцягвалі чалавечыя косьці, чарапы валяліся сярод вуліцы - такую сюррэалістычную карціну мусілі праз цэлыя сакавік-красавік назіраць жыхары вуліц Новая і Чарнышэўскага ў Гародні. Рэч у тым, што разьлеглыя тутэйшыя ры надумалі засыпаць грунтам, які прывозілі з стадыёну "Нёман".

Любасьць цяперашняга кіраўніцтва краіны да спорту ведамая даўно, таму нікога не зьдзівіла пастанова аб рэканструкцыі стадыёну "Нёман", прынятая на найвышэйшым роўні. Заказцам выступіла ўпраўленьне фізычнай культуры, спорту і турызму, а выканаўцам - унітарнае прадпрыемства "Гроднапромбуд". Праект рэканструкцыі распрацаваў інстытут "Гроднаграмадзянпраект". І ўсё добра было б, каб жа... ня тыя могілкі, дзе цяпер ляжыць стадыён... "Калі распачалася праца - мы пачалі знаходзіць чалавечыя косьці, некаторыя знаходзілі нават залатыя зубы", – кажа адзін з працоўных "Гроднапромбуду". Нельга сказаць, што для аўтараў праекту рэканструкцыі гэтыя знаходкі сталіся нечаканасьцю. "Волею лёсу я працаваў у будаўнічым праўленьні, якое збудавала гэты стадыён. Запраўды там раней ляжалі габрэйскія могілкі, але тады гэта праігнаравалі", – кажа Рышард Кацынэль, галоўны інжынэр "Гроднаграмадзянпраекту". Старэйшыя гарадзенцы па сёньняшні дзень успамінаюць, як раўналі зь зямлею тыя клады, а магільнае каменьне клалі ў падмурак будучага стадыёну. Успамінаюць таксама і пра марадзёраў, ахвочых да габрэйскага золата... Так было ў 1963 годзе, але няшмат зьмянілася ў галовах гарадзенскіх чыноўнікаў, калі грунтам з стадыёну, уперамешку зь людзкімі касьцімі, надумаліся засыпаць сьметнікі.

"Спачатку ўсё было нармальна. Ямы засыпалі. Але пазьней пайшлі дажджы - і косьці сталі выглядваць з-пад пяску", – расказвае Вікторыя Назарэнка, адна зь мясцовых жыхарак. Людзі абураліся: "Мы гэтулькі часу зьвярталіся да мясцовых уладаў па дапамогу ў справе гэтых яроў! Як пойдзе дождж, дык нельга было па вуліцы прайсьціся - хіба што ў ботах. І вось, дапамаглі нам - цяпер могілкі маем пад бокам!" – бядуе мясцовая пэнсіянэрка. Рэакцыю гарадзенскіх уладаў адгадаць няцяжка. Праблему здумалі проста замоўчваць.

### Тэатар абсурду

"Так! Ну можа адна-дзьве косткі і трапілі туды разам з грунтам, але ня больш", – запэўнівалі ў урадных габінэтах. Але справа набыла нецікавы для ўлады паварот, калі адзін з жыхароў "праблемнага мікраараёну", Зьміцер Кузаўкоў, захацеў прыбраць раскіданыя па вуліцы чалавечыя чарапы. Пра ягоную знаходку зараз даведаліся журналісты. Зьявіўся артыкул у "Народнай Волі". Потым сюжэт аб "нечаканай знаходцы" паказалі праз АНТ. "Я проста хацеў прыбраць косьці, каб яны не валяліся... Некалі ж гэта былі людзі, таму варта іх і пахаваць па-людзку", – мяркуе дваццацідзевяцігадовы беспрацоўны Зьміцер Кузаўкоў.

Звычайна ў такіх выпадках прынята наракаць на нястачу духоўнасьці і веры ў Бога. Але ў нашым тэатры абсурду гэтыя вінавачаньні проста сьмешныя. Рэч у тым, што адзін з аўтараў праекту рэканструкцыі стадыёну Рышард Кацынэль - адзін зь лідараў Зьвязу палякаў, і да таго ж - апантаны каталік. На мінулым зьезьдзе Зьвязу палякаў менавіта ён прапаноўваў прыняць рэзалюцыю згодна зь якою кожны паляк абавязаны быць каталіком. А тым часам Кузаўкоў, нявернік - я адумысна ў яго пытаўся. І пазьбіраў косьці ён адно таму, бо "не па-людзку гэта". Тое, што не па-людзку для атэіста Кузаўкова, сталалася цалкам нармальна для верніка Кацынэля.

### Эпідэмія

Вось жа, на пачатку мая ў Гародні выбухнуў сэрозны мэнінгіт. Галоўныя сымптомы хваробы - высокая тэмпэратура, боль галавы і ваніты. Дакладная прычына пошасьці пакуль што няведамая. "Мы лічым, што прычынаю сэрознага мэнінгіту ёсьць энтэравірус", – сьцьвярджае Мікалай Кендыш, галоўны лекар Гарадзенскага гарадзкога цэнтру гігіены і эпідэміялёгіі.

Выпадкі хваробы зарэгістраваныя ў розных раёнах гораду і на першы пагляд паміж сабою зусім ня лучацца. Найпэўнейшай вэрсіяй гарадзенскія эпідэміёлягі лічаць на сёньня перадаваньне хваробы праз вадаводы. Таму галоўная парада эпідэміёлягаў для гарадзенцаў, якія хочуць унікнуць хваробы - ня піць негатаванае вады. Разам з тым у горадзе працягвае рэалізоўвацца цэлы шэраг адэпідэмійных мерапрыемстваў. На ўсіх вадабраньнях, а іх у Гародні чатыры, уведзена гіпэрхляраваньне вады і ўзмоцнены кантроль за яе якасьцю. Апрача таго карантынавыя і адэпідэмійныя мерапрыемствы праводзяцца ў установах, дзе выяўленыя выпадкі хваробы. "У зьвязку з

выяўленьнем хваробы ў нас робяцца карантынавыя мерапрыемствы: дызэнфэкцыйная апрацоўваньне, адпаведнае пратаньне, штодзённы агляд дзяцей лекарамі-пэдыятарамі і спэцыялістамі. Таксама ўведзены маскавы рэжым для супрацоўнікаў садкоў," – апавядае Натальля Мацюкевіч, старшая мэдычная сястра дзіцячага садку № 24, дзе выяўленыя 4 выпадкі хваробы.

Відаць, менавіта ўвядзеньне маскавага рэжыму для супрацоўнікаў дзіцячых садкоў і школаў паспрыяла таму, што па Гародні папаўзьлі чуткі, дзей у горадзе выяўленыя выпадкі атыповае пнэўманіі (SARS), а гарадзкія ўлады хаваюць гэта ад насельніцтва. Але як паведамілі ў Гарадзенскім гарадзкім цэнтры гігіены і эпідэміялёгіі - на сёньняшні дзень у горадзе не зарэгістравана аніводнага выпадку хварэньня на атыповую пнэўманію, а хваробы на сэрозны мэнінгіт ня маюць да SARS жаднага дачыненьня. Разам з тым, гарадзенскія лекары прагназуюць далейшы ўзрост захворваньняў на мэнінгіт.

сэрозны мэнінгіт шырыцца кантактна-бытавым і паветрана-кроплявым спосабамі, дык, можа стацца, колькасьць хворых па-за абсягамі Гародні цяпер будзе моцна ўзрастаць. На тэрыторыі Гарадзенскага раёну ўжо пачаліся адэпідэмійные мерапрыемствы.

Гарадзенская абласная інфэкцыйная бальніца цяпер не дае рады прыняць усіх хворых, таму адумысныя палаты для хворых на мэнінгіт выдзеленыя ў іншых бальніцах гораду. Па Гародні ходзяць чуткі, што ўжо аднатавана некалькі сьмяротных выпадкаў. "Афіцыйна вам заяўляю, што ніхто не памёр. Хвароба ідзе ў лёгкай і сярэдняй форме. Няма ніякіх складанасьцяў, мы ўжо выпісалі 34 асобы..." - цьвердзіць Станіслаў Ількевіч. Але няўсе вераць такім дэклярыцыям. "Ад самага пачатку зьвесткі пра хваробу замоўчваліся, дык чаму гэта ня можа адбывацца і зараз? Я ня веру афіцыйным паведамленьням, чыноўнікі проста прыкрываюць сябе," – лічыць Анатоль Хацько, бацька адной з хворых дзяўчынак.

Варта зазначыць, што вуліцы Новая і Чарнышоўскага - гэта не адзіныя месцы ў горадзе, куды трапіў грунт з стадыёну. Трэба таксама падкрэсьліць, што аніякія гігіенічныя меры ў час працы на стадыёне "Нёман" не чыніліся. Таму адпрэчваць, дзей прычынай хваробы можа стаць жвір з стадыёну нельга. Але разам з тым, значных агнішчаў хваробы на вуліцах Новай і Чарнышоўскага, дзе была найбольшая колькасьць касьцей і грунту з стадыёну, не заўважаецца.

### *Мэнінгіт выйшаў па-за межы Гародні*

Дакладна ведама, што выпадкі хварэньня на сэрозны мэнінгіт зарэгістраваныя ў вёсках Адэльск, Азёры, Квасоўка і Калбасіно. Інфармацыю пра гэта пацьвердзілі ў Гарадзенскім Абласным Цэнтры гігіены і эпідэміялёгіі, засьцерагаючы, што канчатковы дыягназ яшчэ не пастаўлены. Мажліва, гэта толькі вяршыня айсбэргу. Лекары досыць нэрвова рэагуюць на пытаньні пра пашырэньне геаграфіі хваробы. "Я лячу хворых, а не правяраю іх месца жыхарства," – заявіў Станіслаў Ількевіч, галоўны лекар Гарадзенскай абласной інфэкцыйнай бальніцы.



Гарадзенскія эпідэміёлягі прычыну шыраньня тэрыторыі, дзе ёсьць выпадкі хваробы, тлумачаць гэтак. "Інкубацыйны пэрыяд хваробы складае да 10 дзён, і дзеці, якія разьехаліся на канікулы - цяпер зьвяртаюцца да лекараў паводле месца жыхарства," – кажа Аляксандар Руфкін, намесьнік галоўнага лекара абласнога Цэнтру гігіены і эпідэміялёгіі. Але гэта не зусім так. Прыкладам, ў Азёрах, Адэльску і Квасоўцы захварэлі мясцовыя жыхары. "Хворы наведаў Гародню, дзеў яго сваякі. Пасьля вяртаньня - дала ведамасьць хвароба і яго шпіталізавалі," – расказвае Таццяна Цітькова, пэдыятар Азёрскай бальніцы. Варта адзначыць, што ў Адэльску і Квасоўцы хворыя не наведвалі Гародні, значыць, выток хваробы такі застаўся нявысьветлены. Раз

### *Помста?*

Інфармацыйная сытуацыя з шыраньнем мэнінгіту выглядае падобна. Два тыдні ўсё замоўчваецца. У той момант, калі варта абвесьціць насельніцтва пра хваробу - робіцца ўсё, што мага і немага, каб зьвесткі пра хваробу не пайшлі "ў этэр". "Вы хочаце панікі?" – тлумачылі пазьней затрымку паведамленьня ў Гарадзенскім гарадзкім цэнтры гігіены і эпідэміялёгіі. Амаль адразу пасьля паведамленьня па горадзе паўзуць чуткі, дзей хвароба зьвязаная з рэканструкцыяй стадыёну "Нёман". Вірус нібыта вызваліўся ў час працы на тэрыторыі былых могілак. Выходзіць, што выбух хваробы - помста памерлых, чый спакой парушылі. Гарадзенскія эпідэміёлягі называюць гэта дэзынфармацыяй, але адначасна прызнаюць, што вірус можа захоўвацца ў жвіры.

### *Пракуратура ня бачыць парушэньняў*

На момант напісаньня артыкулу Пракуратура Ленінскага раёну завершыла праверку на скаргу старшыні габрэйскай грамады Гародні Міхала Каржа. Парушэньняў права ў дзеяньнях гарадзенскіх уладаў у рыхтоўлі і чыненьні рэканструкцыі стадыёну "Нёман" ня знойдзена.

Праверку на скаргу старшыні праводзіў намесьнік пракурора Аляксандар Абрамовіч. Ён, фактычна, пацьвердзіў тую інфармацыю, якую раней пашырыла прэсавая служба Гарадзенскага гарвыканкаму. Згодна з даньнямі праверкі "невялікая колькасьць касьцей" апынулася на вуліцы Новай і Чарнышоўскага "выпадкова, разам зь мерзлым грунтам". А таму вінаватых няма. Будаўляныя працы на стадыёне "Нёман" працягваюцца, але цяпер работнікі пабіраюць косьці ў адумысныя кантэйнэры. Іх канчатковы лёс пакуль што ня высьветлены.

"Пракуратура ўлічыла, што было знойдзена паразуменьне паміж намі і ўладамі. У нас была сустрэча з губэрнатарам Саўчанкам, цяпер сытуацыя пад кантролем," – лічыць Міхал Корж. Разам з тым прыбіраць пазасталыя косьці, якія валяюцца па вуліцах Новай і Чарнышоўскага цяпер пэўна што ніхто ня будзе.

Пракуратура Ленінскага раёну распачала таксама праверку на факт выбуху ў Гародні мэнінгіту. З адпаведнаю скаргаю зьвярнуўся туды бацька адной з захварэлых дзяўчынак, Анатоль Хацько. Як скончыцца разбіраньне справы заражэньня мэнінгітам каля 250 чалавек, большасьць зь якіх дзеці ў веку ад 2 да 14 гадоў? Ці пракуратура выкажа большую прынцыповасьць да службовых асобаў, як гэта адбылося ў выпадку з рэканструкцыяй стадыёну? Хутчэй за ўсе не. Сёньня не ў цане ні людзкое жыцьцё ні людзкая годнасьць. І гэта канчатковы дыягназ.

***Андрэй Адляніцкі***

# Праўнае збачэнства

## Уплыў савецкай сьведамасьці на праўную культуру беларусаў

*Праўная сведамасьць беларускага народу гістарычна сфармавалася на падставе праўных звычаяў і законаў. Найбольшымі з апошніх былі статуты Вялікага Княства Літоўскага, прынятыя ў XVI стагоддзі. Гэтыя нармацыйныя акты ляжалі цалком ў эўрапейскай традыцыі права. Адпаведна гэтаму і праўная сьведамасьць беларусаў адпавядала эўрапейскаму роўню. Асобныя нормы статутаў дзеілі нават пасьля далучэньня ВКЛ да Расейскае імпэрыі. Расейскае права пасьля рэформаў цара Пятра I таксама адпавядала эўрапейскім фармальным стандартам, хоць і не слаадбіта к дэспатычнага рэжыму кіраваньня расейскаю краінаю. У 60-х гадох XIX стагоддзя расейскі цар Аляксандар II правёў гэткія глыбокія рэформы ў галіне права і судовага ўладкаваньня, што яны дагэтуль застаюцца ўзорам для сёньняшняе расейскае ўлады, дагэтуль аналізуюцца расейскімі спэцыялістамі ў галіне тэорыі і гісторыі права дзеля дасканаленьня сучаснага расейскага заканадаўства.*




### Нармаванае збачэнства

Савецкае права, уведзенае бальшавікамі, наадварот, мела зусім іншую супраць папярэдніх праўных сыстэм існасьць. Яно было настолькі неадэкватным у дачыненьні да рэчаіснасьці, настолькі жорсткім у мэтадах забесьпячэньня сваіх загадаў, што цалкам выпала з кантэксту эўрапейскай, і нават расейскай, праўнай культуры. Таму ёсьць патрэба дасьледаваць уплыў савецкага таталітарнага права на сьведамасьць сучасных грамадзянаў Беларусі і адваротную лучнасьць: уплыў савецкай сьведамасьці на сучаснае беларускае права.

Першай адметнаю рысай савецкага права была ягонаянежыцьцёвасьць, неадпаведнасьць патрабаваньням натуральнага, надзённага чалавечага жыцьця. Гэта вынікала з утапічнасьці камуністычнай ідэалёгіі. З таго, што камунізм ёсьць недасягальнаю ў рэчаіснасьці мараю, папросту, казкаю. Казку нельга зьдзейсьніць у жыцьці. Нават, калі скарыстаць сама жорсткія сродкі для прымусу людзей у мэтах ўвасабленьня казкі ў жыцьцё.

Адсюль вынікае знакаміты савецкі неўміручы праўны нігілізм, які дагэтуль складае найістотнейшую частку праўнае сьведамасьці беларусаў. Калі закон не адпавядае патрэбам жыцьця, інтарэсам людзей, то навошта яго выконваць? Так думае ўсякі чалавек, пастаўлены ў умовы, калі законы замінаюць ягоным інтарэсам.

Чаму нельга вольна гаспадарыць на сваёй зямлі? Чаму нельга свабодна прадаць прадукту свае працы? Чаму нельга на гэты конт выказаць свае думкі? Чаму ўсё гэта падпадае пад склад злачынства: такога як спэкуляцыя, прыватнае прадпрыманьне, контрэвалюцыйная прапаганда? Кожнам увідавочна, што здабываньне сродкаў для існаваньня ня можа быць злачынствам, бо тады спыніцца само жыцьцё. Выказваньне думак таксама нельга забараніць, інчай спыніцца прагрэс.

У выніку нашыя грамадзяне падышлі да казачнага, утапічнага савецкага права бальшавікоўпа-народнаму проста. Яны ягоне выконвалі альбо парушалі штодзённа ды ў масавым маштабе. І ня бачылі ў гэтым нічога кепскага. Што цалкам зразумела: лепш быць жывым, чым законлівым.

Тэарэтык камунізму Маркс казаў, дзей капіталіст прысабечвае дадатковы (прыбавачны) прадукт, які напрацавалі рабочыя і сяляне. Савецкія камуністы, якія на словах змагаліся з капіталістамі, на справе адбіралі ўпрацоўных ня толькі дадатковы прадукт, яны адымалі ў іх нават тое, што патрэбнае было для ўзнаўленьня вытворчасьці і рабочае сілы. Яны ператварылі савецкіх працаўнікоў у рабоў, якія працавалі ў калгасах за гэтак званыя працадні-"палачкі", на якія ім выдавалі дробязныя прадукты земляробства. А маглі і невыдаваць. На заводах заплата не пакрывала выдаткаў на харчаваньне і жытло для рабочых.

Адным словам, дзяржава нахабна абкрадала грамадзянаў. Для абароны нарабаванага дзяржава прыняла законы, паводле якіх расстрэльвала сваіх грамадзянаў за зразаньне жытніх каласкоў ці выкарыстаньне ў гаспадарцы пары ўжываных цэглаў. У адказ грамадзяне не лічылі, і дагэтуль ня лічаць, немаральным абкраданьне дзяржавы. Галоўнае - не папасьціся. У гэтым усе салідарныя. Гэтае стаўленьне нашыя работнікі перанесьлі і на дачыненьні з сучаснымі прадпрымальнікамі, якія дзяруць скуруз працоўных ня горш за бальшавікоў. Украсьці збожжа з фэрмы, жалезіну з цэху бэнзын з машыны, шмат сала ці мяса з сталоўкі, кавалак тканіны з атэлье – гэта не злачынства, а толькі стыхійнае пераразьмеркаваньне раней украдзенага, вынік усьведамленьня народам гістарычнага досьведу дзеяньня савецкай эканамічнае сыстэмы, мусовасьць дзеля выжываньня.

Тым часам украсьці ўсуседа – велізарны грэх. Які асуджаецца ўсімі. Нячысты на руку сусед, супрацоўнік, сваяк – бясспрэчны злодзей. Такога трэба бязьлітасна караць. Аднак, калі справа датычыць дзяржаўнае, калгаснае, прадпрымальніцкае маёмасьці, запавет "не крадзі" перастае дзеіць.

### Карнікі

Адсюль вынікае наступны, другі, фэномэн нашай праўнае сьведамасьці – нянавісьць да супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Іх успрымаюць у якасьці карнікаў, якія караюць людзей не за нейкую канкрэтную шкоду для грамадзтва, а за прыналежнасьць да рабскага племя. Усё грамадзтва дзеліцца на дзьве супраціўныя часткі: парушальнікі права і ахоўнікі права. Звычайны грамадзянін ня можа ўявіць, што дзяржава, закон, "мент" будуць бараніць ягоныя інтарэсы. Бо навошта? Закон жа прыдуманы бальшавікамі не для абароны людзей, а для трыманьня іх у слухмянасьці.

Былы прадстаўнік СССР ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў неяк расказваў аўтару гэтых радкоў як у Нью-Ёрку на сьвята Раства Хрыстовага кіроўцы машын, якія праязджалі праз дарожны паліцэйскі пост, пакідалі дзяжурнаму паліцаю падарункі: віскі, закуску, цацкі. Ці можам мы ўявіць падобнае ў Беларусі? Закон і інтарэсы нашых грамадзянаў даўно разышліся і ядна цца не зьбіраюцца.

Нянавісьць да збачэнскага права беларус пераносіць на начальства, як на ініцыятара і носьбіта такога права. Кожны начальнік, як мяркуе наш грамадзянін, мае, з аднаго боку, змогу націснуць на простага чалавека з дапамогаю права, а з другога - націснуць насуперак праву, калі раптам закон бароніць (не такая ўжо частая справа) простага чалавека. Начальства ў нас

стаіць па-за межамі права. Вось чаму просты беларус так ухваляе змаганьне вышэйшага начальства з начальствам ніжэйшым, у тым ліку праўнымі сродкамі. У тое, што перад законам усе павінны быць і ёсьць роўнымі, беларус не паверыць ніколі. Але яму прыемна, калі беспакаранасьць яго начальніка спыняецца начальнікам вышэйшым.

Беларус думае так: мяне, калі я пападуся за крадзеж, пакараюць. А начальнік крадзе фактычна беспакарана. То няхай і начальнік разпораз пацерпіць. Колькі разоў даводзілася чуць наступнае разважаньне. Злоўжываньні ў уладзе – рэч натуральная, бо, каб мы самыя мелі ўладу, то гэтаксама, а то і болей, кралі б. Працаваць і зарабляць, а ня красьці, каб забясьпечыць прыстойнае існаваньне,- такую магчымасьць беларус не ўяўляе ў прынцыпе.

### *Закон і палітыка*

Зь першых двух выступае і трэці фэномэн праўнае сьведамасьці сучасных беларусаў – грэбаваньне законам з боку дзяржаўных служэбнікаў, праваахоўнікаў і судовых чыноў. У свой час камуністы заявілі, што закон ёсьць выражэньнем палітыкі партыі. Вынікала, што, калі закон супярэчыць палітыцы партыі, то павінна ўжыцьцяўляцца палітыка, а не закон. Так і павялося: усякая палітычная альбо асабістая дамэтнасьць чыноўніка пераадольвала ўсе законы. Савецкі і сучасны беларускі чыноўнік ня лічыць сябе скаваным такой фармальнасьцю як закон.

Савецкае права ёсьць нармаваны генацыд. Людзі тут падлягаюць адказнасьці на за канкрэтную віну, а на падставе нейкіх сацыяльных прыкмет: паходжаньня, маёмаснага стану, веравызнаньня, палітычных паглядаў і г.д. Расейскі юрыст Цільле сьцвярджаў, што супрацоўнікі савецкіх праваахоўных органаў выступаюць фактычнымі выканаўцамі-кілерамі, якім даюць загады-заказы палітыкі. Адсюль псыхалёгія савецкіх праваахоўнікаў – за грошы і пад патранажам (пад "дахам") улады яны гатовыя выканаць хоць які загад-заказ, незалежна ад таго, адпавядае загад закону, ці не.

Нашыя грамадзяне не ўспрымаюць права сваёй дзяржавы, бо яно замінае ім жыць. І замінае ўсама пачварны, сама жорсткі, сама гвалтоўны і бязглузды спосаб. Здавалася б, яны павінны жадаць паслабленьня праўнага ўціску. Ажно не, наадварот, яны вітаюць найсуровейшыя меры навядзеньня парадку, уведзеныя беларускай дзяржавай у сярэдзіне 90-х гадоў XX стагоддзя. Такія, як змаганьне з карупцыянэрамі і валютнікамі, страйкоўцамі ды апазыцыянэрамі, заходнімі інвэстарамі і ўсходнімі алігархамі.

Гэтым грамадзяне нібы такажуць: з намі інакшай нельга. Праўны нігілізм і праўны фэтышызм зьліліся ў праўнай сьведамасьці беларусаў ў адно. Раз грэбуюць законам усе, то навесьці парадак, лічаць беларусы, бяз праўнага насіленьня ўсамажорсткіх формах - нельга. Ніхто не задумваецца, што можа існаваць закон справядлівы, які адпавядае інтарэсам асобы і грамадзтва. Закон, які ўсе будуць выконваць ня дзеля страху, а таму, што гэта будзе спрыяць інтарэсам усіх грамадзян.

Калі аб'ядноўваць усе фэномэны савецкага права, якія дагэтуль уплываюць на сьведамасьць беларусаў, то іх належала б зьвесьці да супраціву двух кірункаў. З аднаго боку, мэтна працуе ўтапічны кірунак, які спрабуе зьмяніць натуральную прыроду чалавека і пабудаваць казачнае грамадзтва (камунізм, рынкавы сацыялізм ды інш.). Утапічнаму кірунку працiўляецца рэальнае жыцьцё чалавека, якое ў сваіх штодзённых праяўленьнях ігнаруе і разбурае нежыцьцёвае, збачэнскае права і таталітарныя мэтады ўжыцьцяўленьня ўтапічнага закону.

Выснова адна: жыцьцё пераадолее хоць якое збачэнства.

***Сяргей Самасей***

# "Удзячым Богу за святых..."

*(заканчэньне, пачатак на с. 7)*

Большяк стагоддзе пры касьцёле дзеіла школка, але і яе будынак згарэў у час пажару, і ў 1783 годзе школка здымала "кут у пробашча".

Цяжкі час апошніх гадоў Рэчы Паспалітай і далейшы каляніяльны лёс Гародні не дазволілі заняцца аднаўленьнем рэнэсансавай Фары. У 1793 годзе небясьпечны стан будынку старажытнай Фары прымусіў перанесьці парафіяльную службу ў езуіцкі касьцёл сьв. Францішка Ксавэра, што насупраць праз пляц Рынку. Пра стан пакіненага касьцёлу вымоўна гаворыць малюнак, зроблены графіняй Ганнаю Патоцкай з Тышкевічаў у 1795 годзе пры наведваньні Гародні, дзе мы бачым зруйнаваную сьвятыню.

Расейская імпэрыя, у склад якой увайшла Гародня пасьля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, каб узмацніць уплыў на мясцовае насельніцтва, якое яна далучыла да грона сваіх падданых, актыўна зрэалізоўвала палітыку прасоўваньня расейскага праваслаўя на тэрыторыю Беларусі. Шэраг касьцёлаў і кляштараў зь іх маёмасьцю і нерухомасьцю пераводзіла да праваслаўных ужо на мяжы 18 і 19 стагоддзяў. У 1804 годзе старажытную Фару расейскія ўлады перадалі расейскай праваслаўнай царкве. 7 жніўня 1807 году тут была асьвечаная царква з двума стальцамі.

Праз усё 19 стагоддзе будынак Вітаўтавай Фары часьцяком рамантавалі і перараблялі, каб унікнуць неправаслаўнага выгляду храму. Асабліва дасталося даху, які выдаваў старажытную гатычную традыцыю. Зьмянялі вышыню даху, замест дахоўкі паклалі бляху, але адпаведнага эфэкту не было. Пра выгляд касьцёлу ў 80-ыя гады 19 стагоддзя вымоўна гаворыць гравюра Напалеона Орды з выявай тагачаснае Фары.

Ад 80-х гадоў 19 стагоддзя высокія праваслаўныя саноўнікі сталі ўздымаць пытаньне пра перабудову Сафійскага сабору, які дзеіў у Фары ад 1857 году, згодна з праваслаўнымі ўзорамі. Але справа зацягнулася. Толькі пасьля пажару 1892 году, калі практычна быў зьнішчаны галоўны храм, згарэла званіца і разьбіліся званы,- пачалі рупіцца пра перабудову, якая распачалася ўвесну 1896 году і завершылася ў 1898. 28 Сакавіка 1899 году храм асьвяцілі, а 24 студзеня 1900 году тут урачыста адкрылі Гарадзенскі Катэдральны Сафійскі сабор.

У тым жа годзе пры храме адкрылі двухклясную жаночую і аднаклясную мужчынскую прыхадзкія школкі, якім надалі імя графа М.Мураўёва, ведамага ў Беларусі, як Мураўёў-ве-



*крыж на месцы Фары, зьнішчаны ўнаны*

шаньнік, апалац Масальскага, што месьціўся побач, на вуліцы Замкавай, перадалі Сафійскаму Праваслаўнаму брацтву, якое разьмясьціла тут чарнасоценны Саюз рускага народу.

Толькі ў 1919 годзе храм вярнуўся да каталікоў і стаў выкарыстоўвацца, як гарнізонны касьцёл. Пасьля дзьвюх перабудоў паводле праектаў А.Генэбэрга ў 1923 і А.Сасноўскага ў 1935 гадох будынак набыў рысы раманска-гатычнай архітэктуры.

Пасьля вайны Фара стала аб'ектам навуковых дасьледаваньняў. На яе як на ўнікальны помнік архітэктуры зьвярнулі ўвагу ведамыя савецкія дасьледнікі В. Кудрашоў і А. Квітніцкая. Але нягледзячы на вылучную архітэктурную каштоўнасьць помніка, пастановаю № 213 ад 8 сакавіка 1961 году "Аб зносе аварыйнага будынку вайсковага касьцёлу на Савецкай плошчы", касьцёл быў зруйнаваны ў ноч з 28 на 29 лістапада 1961 году. Імёны тых, хто прыняў гэтае дзікунскае зьмеркаваньне, адкрыў і надрукаваў у 1990 годзе А.Мілінкевіч.

У 80-90 гады 20 стагоддзя старажытная Фара стала вывучацца з мэтай архітэктурнага адзначэньня і ўшанаваньня месца, на якім стаяў касьцёл. Тады помнік дасьледавалі беларускія дасьледнікі Т.Габрусь, Ю. Гардзееў, У. Дзянісаў, Т. Маліноўская, А. Мілінкевіч, А. Трусаў, С. Шайко. На жаль, тады гэтая ідэя не зрэалізавалася, але шэраг публікацыяў, выступы на радыё і тэлевізіі абудзілі памяць і гонар гарадзенцаў, у выніку чаго на месцы былой Фары паставілі крыж, які ўлады пасьпяшаліся прыбраць. Нягледзячы на такую пазыцыю ўладаў, на месцы Фары Вітаўта на Дзяды зноў і зноў тут зьяўляюцца крыжы і запальваюцца зьнічкі, пры якіх моляцца гараджане.

Старажытная Фара Вітаўта – гэта ня толькі помнік архітэктуры, ня толькі незаменны кавалачак нашай культурнай традыцыі, гэта – наша духовая памяць, прымаючы якую мы аддаем пашану тым, хто дбаў пра духовую спадчыну народу, хто асьвяціў нашую зямлю сваім жыцьцём, хто пераказаў нам моц веры і любові, каб і мы сталіся дзецьмі Айца Нябёснага і наўсьлед за Янам Паўлам II прамовілі: "Дзякуем Богу за сьвятых, якія дапамагаюць нам быць цьвёрдымі і пільнаваць цаверы! Праз іх дзеіць Дух Праўды, які ад Айца паходзіць".

***Т. Кавэцкая***

# Беларусы Беласточчыны ў выбарах пасьля 1989 году



Сьвяткаваньне ўгодкаў БНР у Беластоку, 1991 год

*"СП" працягвае рэтраспэктыўны агляд удзелу беларусаў Беласточчыны ў выбарах рознага роўню ў Польшчы апошніх пятнаццаці гадоў. Упэўнены, што аналіз Міхася Андрасюка будзе цікавы ўсім, хто цікавіцца грамадзка-палітычным жыцьцём беларусаў у блізкім замежжы. Як заўсёды, захоўваем стылі правапіс аўтара.*

## *Парляменцкія выбары 1991 і 1993*

Ужо ў лістападзе 1990 га года Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне прыняло пастанову аб самастойным удзеле ў бліжэйшых парляменцкіх выбарах. Адбыліся яны 27 га кастрычніка 1991 га года. Насуперак ранейшым намаганням, зараз таксама беларусы не пайшлі да выбараў адным камітэтам. Традыцыйна ўжо беларускае не спрацавала з праваслаўным. Яўген Чыквін, лідар Праваслаўнага Брацтва паклікаў Выбарчы камітэт праваслаўных, як кааліцыю: Праваслаўнае барацтва, Беларускае грамадска-культурнае таварыства, Саюз украінцаў Падляшша. Другі камітэт Беларускі выбарчы камітэт склалі Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне, Беларускае аб'яднанне студэнтаў і Літаратурнае аб'яднанне „Белавежа".

„Свая зямля, хлеб і вера" пад такім лёзынгам Беларускі выбарчы камітэт пайшоў да выбараў. „Ці жыць без сваёй зямлі? Вядома, можна, але быцьцё гэтае як таго парабка ў панскім двары. Працаваць і есці будзеш, ды ўсёне на сваім і не сваё. Ці магчымы свой хлеб без сваёй зямлі? Так ёсьць, і можа быць: есці хлеб з несваёй зямлі. Але тады твой лёс не будзе тваім, а толькі ласкава адпушчаным табе. Ці вера свая без сваёй зямлі й сваёго хлеба можа быць? тут ужо ўсёясней яснага: не." Гэта цытата з выбарчай лістоўкі Беларускага камітэта. Камітэт зарэгістраваў сваіх кандыдатаў у сямі выбарчых акругах: горад Варшава, ваяводства слупскае і кашалінскае, ваяводства гданскае, ваяводства эльблёнскае і альштынскае, ваяводства бяльска-падляскае і сядлецкае, ваяводства врацлаўскае і, вядома, у акрузе беластоцка-сувальскай.

Такім чынам беларусы задумалі збіраць галасы і ў другіх рэгіёнах Польшчы. Усё такі, якраз у гэтых выбарах Беларускі камітэт атрымаў малую падтрымку 7859 галасоў. Самую значную колькасць 4435 у беластоцка-сувальскай акрузе. Але таксама амаль дзве тысячы ў кашалінскім і слупскім ваяводствах. У апошніх акругах галасавалі за нашых кандыдатаў дачатырохсот няў асоб. Прыкладова ў Гданьску 379, а сама менш у Вроцлаве 161 голас.

Выбарчы камітэт праваслаўных канкурэнт беларускаму набраў 13788 галасоў і лідэр камітэта Яўген Чыквін атрымаў соймавы мандат. Кандыдат Беларускага выбарчага камітэта ў Сенат Ян Чыквін набраў за дваццаць сем тысяч галасоў, больш за кандыдата Праваслаўнага камітэта, больш таксама за беларуса Сяргея Плеву які балаціраваўся ад левых дэмакратаў, усё такі гэтая колькасць аказалася недастатковай у параўнанні да кандыдатаў, за кім стаяў каталіцкі электарат. Выбарчая кампанія ў 1991 годзе праводзілася жменькай энтузіястаў. Не спрыялі пасьпяховай агітацыі сціплыя фінансы, адсутнасць сродкаў транспарту, а таксама факт, што беларусы не змаглі да гэтых выбараў задзіночыць сваю сілу. І ў рэшце рэшт упершыню спрацаваў палітычны капітал Владзімежа Цімашэвіча, накоплены падчас апошніх прэзідэнцкіх выбараў. Цімашэвіч набраў 54 000 галасоў, у значнейшай колькасці беларускіх.

Варта сказаць, што ніколі пазней Беларускія выбарчыя камітэты не выйшлі за падтрымкай паза мяжу Падляшша. Выбраны ў кастрычніку 1991 года Сойм працаваў няпоўныя два гады. Па прычынах, якія не маюць якраз дачынення да нашай тэмы, прэзідэнт Валэнса развязаў парлямент. Гэта абазначала датэрміновыя выбары ўверасні 1993 года.

Беларускія арганізацыі, а таксама Праваслаўнае брацтва, пайшлі да гэтых выбараў у супольнай кааліцыі. Гэта павысіла колькасць галасоў да дзесяці тысяч, на тры тысячы больш у параўнанні да набраных у папярэдніх выбарах, аднак здабыць соймавы мандат не ўдалося. Сімпатыі беларускага электарату канчаткова замацаваліся на асобе Цімашэвіча. Яўген Чыквін, які паклікаў Праваслаўны выбарчы камітэт і балаціраваўся ўСенат, набраў аж пяцьдзесят адну тысячу галасоў аднак нязначна прайграў з прадстаўніком СЛД і кандыдаткай Аб'яднання каталіцкіх сем'яў.

## *Выбары ў самакіраванне 1994*

9 чэрвеня 1994 га года адбыліся выбары ў самакіраванне. У гэтых выбарах не было беларускага камітэта, які б спалучаў выбарчую акцыю. У паасобных гмінах беларусы пайшлі да выбараў у розных кааліцыях абапіраючыся на мясцовыя ўмовы. І так: у Беластоку Беларускі выбарчы камітэт знайшоўся ў камітэце праваслаўным гэтая кааліцыя набрала 5015 галасоў і атрымала тры мандаты ў Раду горада; Беларускае грамадска-культурнае таварыства прыступіла ў Самаўрадавую кааліцыю „Левіца", аднак прадстаўнік Таварыства не атрымаў мандат у гарадскую раду.

У Бельску Падляскім заснавалася „Бельская кааліцыя". Склалі яе Беларускі выбарчы камітэт, Саюз левых дэмакратаў, Унія працы, Саюз украінцаў Падляшша і Аб'яднанне польскіх настаўнікаў. У рэзультаце Каліцыя ўзяла 18 з 28 мандатаў у Раду горада, а таксама паклікала бурмістра стаўім Андрэй Сцепанюк ад Беларускага выбарчага камітэта.

У Гайнаўцы Беларускі выбарчы камітэт пайшоў супольна з СЛД як кааліцыя „Дэмакратычны выбарчы камітэт". Тут таксама кааліцыя перамагла, здабываючы, як і ў Бельску 18 з 28 мандатаў, у рэзультаце Старшынём Рады быў выбраны прадстаўнік Беларускага камітэта Якуб Астапчук.

У гміне Гарадок, як і чатыры гады раней, перамог у выбарах камітэт Беларускага дэмакратычнага аб'яднання, прадаўжаючы кадэнцыю свайго войта Яўгена Семянюка на чарговыя чатыры гады.

У апошніх гмінах беларусы пайшлі да выбараў як незалежныя кандыдаты, або прадстаўнікі польскіх партыяў.

*(працяг будзе)*



## *Ваўкавыскі раён, як і іншыя рэгіёны Гарадзеншчыны, багаты сваёй архітэктурнаю спадчынай. Нават тое, што ацалела пасьля віхураў рознага кшталту захопніцкіх войнаў, пасьля руйнаваньня савецкай уладай храмаў і рабаваньня прыватна-ўласных забудоў, уражвае падарожніка.*

Асаблівацікавай падаеццагісторыя прыватныхуладаньняўсядзібнагатыпу. Нягледзячы на скрайне занядбаны стан бальшыні зь іх сёньня, сучасны вандроўнік будзе захоплены, уявіўшы колішнюю веліч. Найярчэйшай пэрлінайу гэтым сэнсе падаецца сядзіба ў **Красках**. Належала яна спачатку Булгарынам, а ад сяр. XIXст. да 1939 г. роду Сегенеў, якія да пачатковай драўлянай пабудовы дабудавалі ў 1905 г. мураваны двухпавярховы палац. Увесь палацава-паркавы комплекс займае каля 6 гектараў. Яшчэ адна адметная сядзіба на беразе рэчкі Зяльвянкі існуе ў **Падароску**. Пабудаваная яна была ўканцы XVIII ст. найверагодней Канстанцінам Чачотам, альбо ранейшымі ўладаньнікамі Грабоўскімі. Тэрыторыя колішняга маёнтку, апошнім уладаньнікам якога, перад нашэсьцем саветаў, быў Раман Бохвіц, аточаная мураванаю агароджаю з цаглянаю брамай. Іншыя ведамыя сядзібы ваўкавыскай зямлі: **Тэалін** (сяр. XIXст.), колішняе валоданьне графа Струцінскага; **Рэпля** (захаваўся часткова парк другой пал. XIII ст., закладзены ўмаёнтку Патоцкіх); **Гнезна**. У **Хацькоўцах** была сядзіба Ельскіх; у **Росі** ўпалацы Адама Браніцкага была калекцыя старажытных рэчаў; у **Косіне** ў XIXст. – хатні музэй з археалягічным зборам.



сядзіба ў Красках

Найцікавейшыя археалягічныя помнікі ўраёне - гэта комплексы ў **Краснасельскім** і **Карпаўцах**, дзе былі старажытныя крэмнездабыўныя шахты, а таксама сам раённы цэнтар – устаражытным **Ваўкавыску**, жыхары якога будуць сьвяткаваць тысячныя ўгодкі гораду ў 2005 годзе, былі тры ўмацаваныя паселішчы (замкі): Швэдзкая гара, Замчышча, Муравельня. Гэтыя месцы цяпер - археалягічныя помнікі. Да скарбаў Ваўкавышчыны можна залічыць і дзьве жыватворныя крыніцы – у **Краснасельскім** і **Мінеўшчыне**.

Велічным хараством вылучаюцца хрысьціянскія храмы рэгіёну. Пералічым толькі мураваныя храмы, якія маюць асаблівую адметнасьць. Гэта Вацлаваўскі касьцёл ў **Ваўкавыску** (1846-48), Троіцкі ў **Шылавічах** (1907-14, пабудаваны замест драўлянага храму 1600 г.), касьцёл Найсьвяцейшага Імя Марыі ў **Вярэйках** (1848), Сьв.Міхала Арханёла ў **Гнезьне** (пабудаваны каля 1524 г. уладаньнікамі мястэчка Янам і Альжбэтай Шамятовічамі), Яна Хрышчэньніка ў **Воўпе** (1773, пабудаваны біскупам Янам Непамукам Касакоўскім на месцы касьцёлу XVI ст., захоўваецца драўляны аўтар 1-й пал. XVII ст., фундатарам якога быў падканцлер Казімер Лявон Сапега, сын Льва Сапегі), Петрапаўлаўскі касьцёл у **Ізабэліне** (1778, быў пабудаваны графам Грабоўскім як кальвінскі збор), касьцёл Сьв. Яна Хрышчэньніка ў **Мсьцібаве** (1910-19), Троіцкі ў **Росі** (1852-56, захоўваецца цудатворны абраз XVII ст, які перанесьлі з капліцы ўвёсцы **Мачульна**. Да пераліку варта дадаць сёньняшнія праваслаўныя храмы: у **Росі** – Троіцкая царква (1912, захоўваецца абраз Маці Божая Адзігітрыя мяжы XVII-XVIII стст.), у **Кузьмічох** (паміж 1840-50, раней была каталіцкаю капліцаю), у **Воўпе** – Петрапаўлаўская царква (1859, узьведзеная будаўніком Вайнынскім), Міхайлаўская царква ў **Ізабэліне** (кан. XVIII ст.). У **Ваўкавыску** была драўляная Петрапаўлаўская царква (кан. XII ст.), якая да кан. XIX ст. заняпала. Зараз у горадзе ёсьць Мікалаеўская царква (1874), будуецца новы праваслаўны сабор.



касьцёл у Ізабэліне



касьцёл у Ваўкавыску



сядзіба ў Падароску

***Падрыхтаваў Уладзімер Хільмановіч, фота аўтара***

# Аўтару зборніка – 93 гады!

**Новая кніга Апанаса Цыхуна мае назоў “Пройдзеныя шляхі-пуцявіны”. Тут зьмяшчаюцца запісы, успаміны, аўтабіяграфія. Нехта з чытачоў хмыкне гіранічна: ці мала такіх зборнікаў пабачыла сьвет? І хто помніць пра іх аўтараў, тым больш пра зьмест?**

Апанас Пятровіч Цыхун – асоба надзвычай сьціплая, як і кожны запраўдны Беларус. Ніколі нікому ў вочы ня лез. Рабіў сваю справу як настаўнік, дырэктар васьмігодак, інспэктар Гарадзенскага раённага аддзелу народнай асьветы. Мала хто ведаў, што гэты чалавек – апантаны краязнаўца. За час ездаў і паходаў па родных мясьцінах пакрысе назапашваў фактычны матэрыял. Нядаўна выйшла першая брашура, краязнаўча-біяграфічны нарыс “Акадэмік з вёскі Лаша Я.Ф.Карскі” (1992). Уласныя вершы і празаічныя творы зьмясьціў у зборніку “Легенды і балады Гродзеншчыны” (1995). Усё жыцьцё запісваў беларускія народныя песьні Гарадзенскага раёну, якія зьмешчаныя ў кнізе “Песьні з народных глыбіняў” (2000).

У новым зборніку Апанас Пятровіч пазначае асноўныя вехі свайго жыцьця. Пачынае аповяд з роднае вёскі Кунцаўшчына, дае гістарычную рэтраспэктыву гэтай зямлі. Адзначае, што ў тых мясьцінах бывала Эліза Ажэшка і на падставе тамтэйшых падзеяў напісала аповесьць “Дзюрдзі”.

Апанас Цыхун ведае свой радавод да чацьвёртага калена. Ці можа пахваліцца гэтым кожны з нас? Пацісьнем плячыма, разьвядзем рукамі, маўляў, няма часу займацца вывучэньнем. А вось чалавек далёка ня першай маладосьці знайшоў архівы, бібліятэкі, удзячных суразмоўцаў. Знойдзеныя цікавосткі, пачутае старанна занатаваў.

З успамінаў укладзены ўвесь зборнік. Уласная біяграфія шчодра населеная ня толькі людзьмі роднымі і блізкімі, але і тымі, што пакінулі сьлед у памяці Апанаса Пятровіча. У Лашанскай пачатковай польскай школе ўпершыню даведаўся, што тут некалі працаваў настаўнікам бацька акадэміка Яўхіма Карскага - вучонага з гэтае вёскі.

Далей навуку Апанас спасьцігаў у польскай сямігодцы, Гарадзенскай польскай настаўніцкай сэмінарыі. Давучыцца не ўдалося. Прыйшла позва ў войска. Служыў артылерыстам у Вільні. Пасьля дэмабілізацыі, ажаніўшыся, працаваў на гаспадарцы.

Апанас Пятровіч – добры апавядальнік. Яго памяць выдатна захавала імёны і прозьвішчы, найдрабнейшыя падзеі. Здавалася б, ну што можна расказаць пра дробнага гандляра, габрэя Іршку, што зь мястэчка Індура? Але праз гэтую асобу бачыцца нам даваеннае жыцьцё мясцовага габрэйства наагул. З кніжкі можна даведацца пра дзейнасьць гурткоў Беларускай сялянска-работніцкай Грамады, выступленьне ў мястэчку Алекшыцы лідара БСРГ Браніслава Тарашкевіча, якога сяляне не далі арыштаваць паліцыянтам. Кірмаш у мястэчку Луна – яшчэ адна жывая карцінка “з натуры”.

Апанас Цыхун браў удзел ў абароннай вайне 1939 году ў час нападу фашысцкае Германіі на Польшчу, бараніў Варшаву, трапіў у палон да гітлераўцаў. Паводле савецка-нямецкага пагадненьня польскіх салдат, якія нарадзіліся на далучанай да СССР тэрыторыі, вярталі Савецкаму Саюзу. Калі Апанас Цыхун пачуў, што вязуць зноў у лягер, цяпер ужо савецкі, то ўцёк з эшалёну. Баец-вартавы не страляў…

З надыходам Савецкай Арміі як настаўніка ў войска не ўзялі. У 1944 годзе пачалася пэдагагічная работа. Вярнуўся з-пад Кёнігсбэргу брат Іван. Без нагі, зусім слабы. Але не было спакою і Апанасу. Работнікі КДБ Шаляпін і Іваноў арыштавалі яго як шпіёна, якога нібыта скінулі на парашуце. Такіх “шпіёнаў” было затрымана шмат. Гэта былі палякі, якія хаваліся ад прызыву ў Савецкую Армію.

Сардэчны боль Апанаса Цыхуна – родная мова. Ён бачыў як яе перасьледавалі даваенныя польскія ўлады, пасьля савецкія, асабліва ў 50-я -70-я гады мінулага стагоддзя. Аўтар прыкладае табліцу школаў Гарадзенскага раёну, якія былі без прычыны пераведзеныя на расейскую мову выкладаньня.

Успаміны чалавека, які мае вельмі шаноўны век, заўсёды каштоўныя. Калі перагорнутая апошняя старонка кнігі, адчуваеш, што дакрануўся да мінулага, уваччу пабачыў тое, аб чым піша Апанас Цыхун – чалавек таленавіты і назіральны, які добра ведае патрабаваньне мэмуарнай літаратуры: толькі праўда праз уласнае “я”.

***Антон Лабовіч***

# Беларускія “донары” ў Францыі

*заканчэньне, пачатак на с.13*

сьмяротнае кары. Перад дэсантам у Беларусь, у сакавіку 1951 году, Янка стаў сябрам рады БНР і ўпаўнаважаным прадстаўніком ураду БНР. Пасьведчаньне ў Парыжы яму ўручыў на той час Прэзыдэнт БНР Мікола Абрамчык. Кажуць, што ў Францыі захоўваецца і архіў БНР. З Парыжам зьвязаны таксама лёс іншых прэзыдэнтаў і сяброў Рады БНР, у тым ліку - Івонкі Сурвілы. Вітаўт Кіпель у сваёй кнізе “Беларусы ў ЗША” зазначае, што соткі беларусаў служылі ў амэрыканскім войску ў час другой сусветнае вайны. Гэтая тэма яшчэ чакае гісторыкаў-дасьледнікаў.

Пра героя ў-беларусаў паведамлялі і амэрыканскія газэты. Іван Радзюковіч зь Меншчыны быў адным зь першых, хто высадзіўся на берагох Францускай Нармандыі 6 чэрвеня 1944 году пры адкрыцьці другога фронту. Героем вайны быў Дж. Асіпук. Адзначыўся і Майкл Кліменка. Уладзімер Каваленка быў узнагароджаны найвышэйшым крыжам Вайскова-Паветранага Флёту, Мікалай Арэшка атрымаў Кангрэсавы мэдаль. Геройскай сьмерцю загінуў у Францыі Вікеньці Прост, родам з пад Маладэчна. Геройскай сьмерцю загінулі Д.Уладыка, Б.Старадуб, А.Русецкі, А.Саўчук і шмат іншых.

Беларусы змагаліся з фашызмам на ўсіх франтох вайны. У 1945 годзе ў Парыжы пачала выходзіць беларуская газэта “Беларускія навіны”. Яна была крыніцаю палітычнае інфармацыі для беларускай дыяспары ў Заходняй Эўропе і зьмяшчала абвесткі аб шуканьні родных і блізкіх у ЗША.

Парыжанамі былі Пачобут-Адляніцкі, член-карэспандэнт Францускай акадэміі навук, Наркевіч-Ёдка і першая ў сьвеце жанчына-прафэсарка Зоф’я Кавалеўская, Альфрэд Ромэр і мастак, асьветнік Эдвард Паўловіч, які тут выдаў брашуру “Колькі слоў ліцьвіна”. Жыў у Парыжы і вымушаны эмігрант Міхал Андрыёлі, былы паўстанец і мастак. Па вяртаньні на Бацькаўшчыну эмігрант зноў пакараны царом. Пазьней наш зямляк стане настаўнікам расейскіх мастакоў В. і А. Васьняцовых. У Францыі жыў і працаваў ведамы францускі паэт Гём Апалінэр з роду Кастравіцкіх, яго блізкі сваяк - беларускі паэт Карусь Каганец. Тутэйшае прозьвішча паэта засьведчана на помніку могілак Пэр-Ляшэз. З Францыяю зьвязаны лёс Канстанціна Ельскага і Мікалая Судзілоўскага. Першы ведамы як выдатны падарожнік і заоляг, дасьледнік Францускае Гвінэі ў Паўднёвай Амэрыцы. Мікалай Судзілоўскі добра ведамы першнаперш як рэвалюцыянэр і палітык, які стане нават прэзыдэнтам Гавайскіх атокаў. За сваё кіпучае жыцьцё ён пасьпее быць удзельнікам грамадзкіх рухаў Расеі, Польшчы, Францыі, Англіі, ЗША, Японіі, Кітаю, Гавайскіх выспаў.

Пераважная большасьць гэтых ліцвінаў-беларусаў мусіла эміграваць з палітычных прычынаў, бо Бацькаўшчына стала калёніяй Расейскай Імпэрыі. Іхныя здольнасьці зрэалізаваліся па-за межамі Беларусі, яны сталі абаронцамі Свабоды, Нацыянальнымі героямі іншых краін, праўдзейнымі сябрамі замежных акадэміяў. Багата нашых суайчыньнікаў “прыватызавалі” нашыя суседзі. Сёньня, маючы папяровую незалежнасьць, Беларусь працягвае траціць маладую і чынную частку грамадзтва. Ці жне надакучыла беларусам быць “донарамі” далёкіх і блізкіх суседзяў?

***Алесь Крой***




**бюлетэнь «СВОЙ ЛАД»**
**выходзіць 1 раз у месяц**
**наклад 299 асобнікаў**
**для нутранога карыстаньня**
**распаўсюджваецца задарма**
**пры передруку спасылка абавязковая**

**рэдактар - Віктар Сазонаў**
**стылёвае рэдагаваньне - Юры Пацюпа**
**шыхтоўля - Зьміцер Дулько**
**падрыхтаваны да друку: 11.06.2003**
**тэл. 44-24-97, e-mail: sazonau@tut.by**
**адрас для ліставаньня: 230023, Гародня, а\с 121**




**Гарадзенскае аддзяленьне ГА «Фонд імя Льва Сапегі»**